№№93–94
(2821–2822)

26 чэрвеня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

БЛІЦ

Заканчваюцца паўнамоцтвы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў трэцяга склікання. Некаторыя з іх атрымаюць права выхаду на пенсію па ўзросце. Праблем з фінансамі ў іх, вядома, не ўзнікне — яны, як і іх калегі, якія апынуліся на адпачынку год-два таму, верагодна будуць мець у месяц не менш за два мільёны 200 тысяч рублёў.

У той жа час у рабочага, які адстаяў ля гарачай сталеплавільнай печы 40 гадоў, пенсія ледзь-ледзь перавышае 400 тысяч рублёў, а ў былога калгасніка не дасягае і гэтай лічбы. А колькі людзей маюць пенсію ў памеры ўсяго 180—300 тысяч рублёў.

"Народная воля" вырашыла пацікавіцца, як разлічваюць пачуваць на пенсіі тыя парламентарыі, якія пасля заканчэння паўнамоцтваў выйдуць на адпачынак і будуць, у адрозненне ад асноўнай масы людзей, мець нармальны дастатак. Пытанне, з якім газета звярнулася да дэпутатаў, прагучала так:

Вам не сорамна будзе атрымліваць пенсію памерам больш за тысячу долараў, калі ў асноўнай масы людзей яна ў 6—10 разоў меншая?

Сяргей КАСЦЯН,
намеснік старшыні па міжнародных справах і сувязях з СНД:

— Лічу, што высокая пенсія ў дэпутатаў — нармальная з'ява. Так ва ўсім свеце. А колькі я буду атрымліваць, не ведаю. І ўвогуле, тое, што нехта нейкія лічбы называе, не азначае, што ўсе дэпутаты-пенсіянеры будуць столькі атрымліваць. Усё па рашэнні прэзідэнта. Ёсць такое палажэнне...

Ганна БУРАВА,
намеснік старшыні камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі:

— Магчыма, пенсія дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў не маленькая, але яна значна меншая за пенсіі дэпутатаў другіх краін. (*Але ж там і пенсіі ў звычайных людзей у дзесяткі разоў большыя, чым у нас.* — **Рэд.**)

Што тычыцца асабіста мяне, то, нягледзячы на пенсійны ўзрост, на пенсію не збіраюся і гатова працаваць нават за зарплату, якая будзе менш за дэпутацкую пенсію. Я лічу, што атрымліваць пенсію нецікава, выхад на пенсію — гэта адмова ад актыўнай жыццёвай пазіцыі, а мяне такая перспектыва не вабіць, я не ўяўляю сябе пенсіянеркай.

Што тычыцца ўвогуле пенсійнага забеспячэння, то лічу, што яго трэба рэфармаваць. Памер пенсіі мусіць быць адэкватны заробку чалавека. Сёння атрымліваецца, што розніца паміж пенсіямі тых, хто меў высокі заробак і значна павялічваў пенсійны фонд сваімі адлічэннямі ў выглядзе падаткаў, і тых, чый заробак быў сярэднім, амаль аднолькавая, адрозніваецца нязначна. Гэта несправядліва, і дадзеную праблему мы ўздымаем перад урадам.

Лілія КАШАНКОВА,
член камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе:

— Каменціраваць ваша пытанне не буду таму, што яшчэ рана гаварыць пра пенсіі дэпутатаў 3-га склікання. Указ кіраўніка краіны тычыўся толькі нашых калег з папярэдніх дэпутацкіх складаў. А літаральна на мінулым тыдні мы прынялі Закон аб дзяржслужачых і адтуль выкраслілі азначэнне "дэпутат". А ўказ прэзідэнта "Аб штомесячным грашовым утрыманні асобных катэгорый дзяржаўных служачых", між іншым, прымаўся згодна з дадзеным законам.

Вольга АБРАМАВА,
член камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце:

— Якраз зараз я займаюся афармленнем дакументаў на пенсію. І, мяркуючы па ўсім, мая пенсія будзе складаць каля 400 тысяч беларускіх рублёў з улікам майго працоўнага стажу. (*Не трэба прыбядняцца, спадарыня Абрамава,* — **Рэд.**). Таму і разважаць на гэтую тэму я буду толькі пасля верасня...

Уладзімір ШОКАЎ,
член камісіі па працы, сацыяльнай дапамозе, справах ветэранаў і інвалідаў:

— Пакуль пра пенсію не думаю, збіраюся працаваць і далей. Хутка новыя выбары ў Палату прадстаўнікоў, і я планую прыняць у іх удзел у якасці кандыдата ў дэпутаты. А пенсію годную павінны атрымліваць усе.

Ларыса ВЕРШАЛОВІЧ,
член камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстання:

— Думаю, што наўрад ці я буду атрымліваць такую пенсію. Наколькі мне вядома, не ўсім яна прызначаецца, і ўвогуле пытаннем пенсіі я не займалася глыбока, таму што некалькі гадоў у запасе ў мяне яшчэ ёсць. Але ж, вядома, хацелася б, каб усе беларусы атрымлівалі большую пенсію. Першыя крокі, мне падаецца, робяцца, і прафесійныя пенсіі ўжо вылучаны з агульнай пенсійнай сістэмы. І калі будзе ісці накапленне пенсійнага страхавання ў фонд, які будзе выплачваць менавіта прафесійныя пенсіі, магчыма, гэта дазволіць павялічыць агульныя пенсіі ў краіне.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ЮБІЛЕЙ

Гаўрыіл ВАШЧАНКА:

«Завалілі кветкамі, як прымадонну!»

Днямі народнаму мастаку Беларусі, заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР Гаўрыілу Харытонавічу Вашчанку, якога Міжнародны Кембрыджскі біяграфічны цэнтр прызнаў "Чалавекам XX стагоддзя", споўнілася 80 гадоў.

Святкаванне юбілею адбылося ўрачыстым, шматлюдным і вельмі радасным для Гаўрыіла Харытонавіча.

"Самым галоўным для мяне стала тое, што святкаваў дзень нараджэння я на сваёй радзіме — у Гомелі, — распавёў "Народнай волі" сам мастак. — *Там ёсць карцінная галерэя Гаўрыіла Харытонавіча Вашчанкі, дзе на першым паверсе адчынілася мая новая экспазіцыя. На другім паверсе разгорнута сталая экспазіцыя маіх твораў і калекцыя твораў сучасных беларускіх мастакоў, таксама маёй жонкі Мацільды Адамаўны. Галерэя і горад падаравалі мне цудоўнейшую імпрэзу! Прысутнічалі мэр Гомеля Аляксандр Якабсон, старшыня Саюза мастакоў Уладзімір Савіч, дырэктар Нацыянальнага музея мастацтваў Уладзімір Пракапцоў і шмат яшчэ хто.*

Вельмі нечаканым быў для мяне прыезд маёй стрыечнай сястры, якую я больш за 30 год не бачыў".

Юбіляра проста завалілі кветкамі. А родная галерэя мастака падаравала яму карціну з 80 ружамі...

"Адчуваў сябе як прымадонна!" — смяецца ён.

Дарэчы, з 80-гадовым юбілеем Гаўрыіла Харытонавіча павіншаваў і А.Лукашэнка.

Віншаванні народны мастак Беларусі прымае і ў гэтыя дні.

Аднак Гаўрыіл Вашчанка не спачывае на лаўрах, а працягвае працаваць у сваёй цудоўнай майстэрні па вуліцы Сурганава.

"Цяпер мяне хвалюе падрыхтоўка да адказнейшай выставы, якая адчыніцца ў верасні ў Нацыянальным музеі мастацтваў і будзе прымеркавана да майго юбілею".

Гаўрыіл Харытонавіч шчаслівы, што яму былі дадзены доўгія гады жыцця, за якія можна было багата зрабіць і добрага, прыгожага, і нарабіць памылак. Юбіляр таксама верыць, што яго чакае яшчэ шмат чаго напераздзе.

Вольга ПРУДНІКАВА.
Фота photo.bymedia.net



КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Камни преткновения

— Что, немцы и своих евреев убивали?!

Его потрясение было столь велико, что он обошел камни со всех сторон, увидел въевшиеся следы свастики...

Сюда, к "Трем камням", поставленным в разные недавние годы в память о трех тысячах погибших в Минском гетто евреях из Гамбурга, Дюссельдорфа и Бремена, он забрел случайно, приехав из Столбцов навестить друга в больнице неподалеку.

Я спросил, сколько ему лет, как его зовут и в какой сфере он трудится. Лет ему оказалось за сорок, зовут Николай, работает инженером в коммунальном хозяйстве...

Я не знаю, почему я спросил у него об этом. Наверно, потому, что и сам был потрясен: он НИЧЕГО (!) не знал... До сих пор мне казалось, что нет на Земле человека, который ничего не знает о Холокосте.

Николай застегнул пиджак, склонил в задумчивости голову с редкими русыми волосами, потом размашисто перекрестился и медленно пошел в сторону Сухой, сплошь уставленной блестящими телами авто...

Я вернулся взглядом к камням. Нет, не к этим трем от немецких городов, а другим, разбросанным в хаосе прямо у их подножия.

Им сотня лет, этим камням — мацейвам, или памятникам с еврейского кладбища на Сухой, уничтоженного еще в 70—90-х годах прошлого века. От тех лет остался тенистый сквер, сокрытое деревьями и подстриженным газоном место массовых расстрелов минских евреев — ни знака, ни таблички, ни камушка. Поодаль бетонные руины эстрады, танцплощадки и местного значения стадион. Но камни-памятники вылезают из земли до сих пор. Не меньше двух десятков стащили и бросили возле "Трех камней" совсем недавно, когда тянули теплоцентраль вдоль Перекопской...

На следующий день я стал разыскивать людей, которые могли бы прочитать надписи на этих камнях.

Я вспомнил деда Соломона, о котором не думал и которого не вспоминал никогда.

Я представил, как хоронили его в 1916 году, когда он, разнорабочий с Немиги, умер от чахотки, а отцу, младшему из четырех его детей, исполнилось всего два года.

Его везли, наверное, сюда, на Сухую, по Еврейской улице, позже поименованной почему-то Коллекторной. Вот тут были ворота, рядом мастерская кладбищенских каменотесов...

Я не надеялся, конечно, что найду камень с его именем. Но дух его определенно витал над этим местом, заставляя сжиматься горло в покаянии и вине...

Со стороны, наверное, мы производили странное впечатление — Лев Слобин, известный кинодокументалист, переводчик с идиш Семен Лиокумович и я. Кто-то проходил мимо, кто-то останавливался, наблюдая, как немолодые люди склоняются над какими-то камнями...

— Карп, точно, вот фамилия Карп... А вот Цине Файленбоген... — Семен Львович протер сухой травой имя усопшей аж в 1920 году минчанки, волей судьбы и экскаватора оказавшееся в месте, где выгуливают собак...

— А вот на русском, "Бася Уфляндъ, 26 января 1907"...

Подошел человек средних лет, на вид вполне современный — подтянут, аккуратная прическа, уложившая в четкий пробор густую седину, брюки в стрелку, рубашка под галстуком, без пиджака...

— Еще где-то в 75-м я находил камни с именами родственников и знакомых. Камни еще стояли на своих местах...

Я, как у столбцовского Николая, тоже спросил, кто он, как его зовут, кем были его предки с этого кладбища.

— Это не важно... Я видел тут молодую семью — папа, мама, мальчонка лет десяти. Смотри, говорит папа, какой материал! А мальчонка ему — это же памятники!..

Потом мы с Левой Слобиным, вся жизнь которого после войны прошла в этих улицах и дворах, в которых сгинула в безвестности гетто сестренка Таня, спустились к Перекопской, ныне Иерусалимской... Мы шли, спотыкаясь об остатки мацейв, заглядывая в набитые мусором провалы склепов, где рядом с предками прятались мученики гетто...

— Кому понадобилось менять название улицы?! Ведь Перекопская во всех книгах про гетто, во всех справочниках... Вот, еще, — Лев остановился возле очередного торчащего из земли обломка мацейвы с остатками букв...

Мы прошли в начало улицы, мимо огородика с кудрявой картофельной ботвой, чудом уцелевшего на месте снесенных частных подворий. Огромный бетонный куб скрывался в зарослях бурьяна, вокруг валялись пустые бутылки, пачки из-под сигарет, конфетные обертки... Пахло летом и запустением. На кубе значилось, что улица названа "у гонар святкавання 3000-годдзя Іерусаліма"...

"...Можно с уверенностью говорить о привлекательности Беларуси для туристов с еврейскими корнями из Беларуси, которым есть что предложить, будь то духовные, материальные или просто человеческие ценности, связанные с еврейским наследием в Беларуси...". Это из рекламного текста "Белинтуриста".

В списке туристических объектов — кладбище на Сухой...

Кладбище, которого нет.

Мало снова и снова кричать о вандализме, беспамятстве, скрытом и явном антисемитизме, лицемерном попустительстве ему чиновников разных уровней и мастей.

Если все мы, называющие себя белорусским народом, не споткнемся о еврейские, христианские, мусульманские, лютеранские и куропатские камни, не очнемся в грехе не только перед предками — перед самими собой, то навеки пребудем в варварстве, а эту духовную историческую работу сделают за нас (нет, вместо нас!) другие поколения.

Может быть, тот самый мальчик, который воскликнул: "Это же памятники!"

Потому что камни все равно вылезут из земли.

kamerton_41@mail.ru

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Евгению Шигалову необходимо поехать в Лондон

По словам родственников, только там ему могут сделать операцию на сердце.

"Проблема в том, что операцию на сердце ему нужно делать в том же госпитале, где делали и первую операцию, в Лондоне, — говорят родственники председателя совета директоров Торгового центра "Ждановичи" Евгения Шигалова. — И вопрос совсем не в том, что белорусские врачи не справятся с этой задачей. У наших медиков хватает профессионализма, но они не используют то оборудование, с которым работают английские врачи. Если будут оперировать белорусские врачи, то никто не даст гарантию, что все закончится благополучно: шунты, которые у него уже стоят, могут оборваться, что приведет к моментальному летальному исходу. У нас, кстати, есть соответствующее заключение врачебной комиссии".

Но для того, чтобы поехать в Лондон, Шигалов должен быть на свободе.

"Поэтому мы ходатайствуем об изменении ему меры пресечения, — сказали "Народной воле" родственники бизнесмена. — Полагаем, что это важное обстоятельство должны учесть, ведь речь идет о жизни человека..."

Напомним, что в отношении Е.Шигалова возбуждено уголовное дело по подозрению в совершении злоупотреблений служебным положением должностными лицами, повлекших причинение тяжких последствий в виде ущерба экологической среде.

Шигалов свою вину не признает.

Он по-прежнему находится в Республиканском научно-практическом центре "Кардиология". Вход в палату Шигалова находится под круглосуточной охраной.

Марина КОКТЫШ.

БЕЛАРУСЬ—РАСІЯ

...А Барадзін усё не сцішыцца

"У самым хуткім часе грамадзяне Беларусі і Расіі стануць грамадзянамі Саюзнай дзяржавы і будуць карыстацца аднолькавымі правамі", — заявіў 24 чэрвеня на прэс-канферэнцыі ў Мінску дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Павел Барадзін.

Паводле яго слоў, падпісаная 22 чэрвеня ў Брэсце прэзідэнтамі Беларусі і Расіі сумесная дэкларацыя "яшчэ раз пацвердзіла, што мы трымаем курс на стварэнне Саюзнай дзяржавы". Размова ідзе аб "канфедэратыўным уладкаванні" і дэлегаванні шэрагу паўнамоцтваў Саюзнай дзяржаве, а не аб уваходжанні Беларусі ў склад Расіі, падкрэсліў П.Барадзін.

Ён таксама паведаміў, што напярэдадні абмеркаваў з прэм'ер-міністрам Расіі Уладзімірам Пуціным ход падрыхтоўкі да пасяджэння Савета міністраў Саюзнай дзяржавы, якое пройдзе 27 ліпеня. Паводле слоў Барадзіна, у парадку дня пасяджэння пазначана 21 пытанне — "гэта не толькі вытворчыя праграмы, але і пытанні бяспекі грамадзян, духоўнасці, культуры".

ЗА РЕШЕТКОЙ

Почти два месяца нет писем от Александра Козулина

Дочери политика собираются навестить его в колонии в начале июля.

— Последний раз мы виделись с папой 6 мая, — говорит дочь экс-кандидата в президенты Юлия Козулина. — Ездили на свидание в "Витьбу-3". С тех пор папа не прислал ни одного письма, и нас это, конечно, беспокоит. Тем более я знаю, что мои письма он получает, потому что шлю их с уведомлением.

Юлия и Ольга Козулины планируют посетить отца в начале июля. Точная дата краткосрочного свидания Александра Козулина с дочерьми станет известна в конце недели, когда с политиком встретится адвокат Дмитрий Горячко.

К слову, недавно защитник Козулина направил надзорную жалобу на имя генерального прокурора Беларуси Григория Василевича, в которой потребовал все предыдущие решения относительно приговора Козулина отменить, уголовное дело в отношении экс-кандидата в президенты прекратить и освободить его из места отбывания наказания. Свое решение обратиться к Василевичу Горячко объяснил так: "До сих пор мы получали ответы на жалобы из Генпрокуратуры только за подписями заместителей генпрокурора, поэтому я и обратился непосредственно на имя прокурора".

Ответа Дмитрий Горячко пока не получил.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

Мілінкевіч рыхтуе «антыядзерную» кампанію

Зараз палітыкі вызначаюцца са сваім стаўленнем да будаўніцтва АЭС у Беларусі. Наколькі я ведаю, лідэр незарэгістраванага "Маладога фронту" Дзмітрый Дашкевіч выступае за гэты праект, пра што заявіў адкрыта. А цікава, як да ідэі ставіцца Аляксандр Мілінкевіч?

Ганна Паплыка, г.Магілёў.

Аляксандр Мілінкевіч разам з паплечнікамі ўвосень пачне кампанію супраць будаўніцтва АЭС. Пра гэта ён паведаміў на сваім афіцыйным сайце.

— Я катэгарычна супраць будаўніцтва АЭС, — запэўніў Мілінкевіч. — Будаўніцтва АЭС па расійскім праекце толькі ўзмацніць нашу энергетычную залежнасць ад Расіі. Гэта будзе азначаць фінансавую (палітычную) залежнасць ад Расіі: неабходна ўлічваць не толькі кошт будаўніцтва АЭС, але і будаўніцтва горада для персаналу, вырашэнне праблемы утылізацыі ядзерных адкідаў, падрыхтоўку персаналу. Сумарны кошт гэтага праекта будзе складаць не менш за 12 млрд долараў ЗША. У Беларусі гэтых грошай няма. Давядзецца павялічваць знешні доўг, які патрэбна будзе аддаваць з працэнтамі.

Акрамя таго, будаўніцтва АЭС па расійскай тэхналогіі стварае экалагічную пагрозу Беларусі. Расійскія рэактары менш надзейныя, чым, скажам, французскія ці амерыканскія. АЭС будаваць эканамічна немэтазгодна. Бо не выкарыстаны ўсе магчымасці змяншэння энергаёмістасці ВУП. Пасля лета, калі людзі адпачнуць, мы пачнём кампанію супраць будаўніцтва АЭС. Далучайцеся.

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

Зацукраваліся

У студзені—маі 2008 года запасы цукру-пяску на беларускіх прадпрыемствах у 6,4 раза перавысілі сярэднямесячны аб'ём яго вытворчасці, паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу.

Па стане на 1 чэрвеня на складах прадпрыемстваў знаходзілася 213,2 тыс. тон цукру. За пяць месяцаў 2008 года ў краіне вырублена 167,2 тыс. тон цукру-пяску, што на 30,9% больш, чым за аналагічны леташні перыяд. Але потым спахапіліся: навошта рабілі, калі не можам прадаць? У выніку ў маі цукар не вырабляўся.

SOS!

«Сын абяцае ўскрыць сабе жывот»

Фермер з Любаньскага раёна Алесь Касач просіць Аляксандра Лукашэнку абараніць яго сына.

— Мой сын патрапіў у Шклоўскую калонію, — распавядае ён. — На пачатку чэрвеня мне патэлефанавала жанчына і сказала, што яна была на сустрэчы ў калоніі і там даведалася, што ў майго сына склаліся дрэнныя адносіны з адным з супрацоўнікаў установы, паколькі сын адмовіўся даваць таму хабар за тое, што спіць на першым ярусе. Той супрацоўнік, па словах сына, абклаў увесь атрад данінай і застаўляе плаціць. А паколькі мой сын адмовіўся гэта рабіць, няцяжка было здагадацца, як яму там будзе жыць далей. І вось зараз мне стала вядома, што сыну ў калоніі і насамрэч створаны невыносныя ўмовы, а ў адказ на гэта ён збіраецца ўскрыць сабе жывот.

"Я двойчы звяртаўся ў Міністэрства ўнутраных спраў — вынік адмоўны, — піша Алесь Касач Аляксандру Лукашэнку. — Разглядаць маю скаргу яны даручылі таму, на каго я скарджуся. Таму я вымушаны звярнуцца да вас. Уратуйце жыццё майго сына!"

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

КАНФЛІКТ

Авіяшоу праляцела

Першае нацыянальнае авіяшоу "Мінск Аэра-2008" не адбудзецца.

Нагадаем, што "Мінск Аэра-2008" планавалася правесці 3—6 ліпеня на тэрыторыі гісторыка-культурнага комплексу "Лінія Сталіна". Ва ўсялякім выпадку, аб гэтым было публічна аб'яўлена. Але пасля гэтага гісторыя пачала развівацца не па раней запланаваным сцэнарыі...

Спачатку выступіў дырэктар дабрачыннага фонду "Памяць Афгана" Аляксандр Мятла (фонд — суарганізатар мерапрыемства), які заявіў, што "фонд у аднабаковым парадку разарваў адносіны з суарганізатарам мерапрыемства ЗАТ "СолМедыяГран".

"Гэта адбылося з-за адсутнасці ў ЗАТ дагавораў на выступленне расійскіх пілатажных груп "Русские витязи" і "Стрижи", а таксама дакументаў, што дазваляюць правядзенне спаборніцтва па паветраным плаванні на цеплавых аэрастатах, — сказаў Аляксандр Мятла. — *Не было сцэнарыя шоу, якое рэкламавалі некалькі месяцаў таму, няма фестывалю феерверкаў. Усё, што яны рэкламавалі, усё, пра што яны расказвалі ў СМІ, — у цэлым не падрыхтавана".*

Ён таксама зазначыў, што кампанія "СолМедыяГран" выпусціла 250 тысяч білетаў і планавала, што кожны дзень авіяшоу будзе наведваць больш за 80 тысяч чалавек, у той час як "Лінія Сталіна" *"нават з улікам дадатковых месцаў можа прыняць адначасова не больш за 10 тысяч гледачоў".*

— У сувязі з тымі каментарыямі, які даваў у апошні час спадар Мятла, мы хочам зрабіць сваю заяву, — адрэагаваў генеральны дырэктар кампаніі "СолМедыяГрант" Сяргей Салаўёў. — Адзначу, што многія абвінавачанні ў наш адрас неабгрунтаваныя. Напрыклад, мы абвяргаем, што не было дамоўленасці з расійскімі пілатажнымі групамі. Мы атрымалі пацвярджэнне ад пілатажнай групы "Стрижи" аб тым, што яны гатовы наведаць наша мерапрыемства і выступіць. Далей. Мы мелі заяўкі больш як ад 25 паветраплавальнікаў з розных краін свету. Упершыню ў Беларусь планаваўся прылёт на двух паветраных шарах каманды з Арабскіх Эміратаў. Мы хацелі знайсці кампраміс, але не змаглі. І зараз ідзе падмена першага нацыянальнага авіяшоу простым спартыўным святам.

Да апошняга моманту пытанне аб правядзенні авіяшоу, што называецца, вісела ў паветры. Але на гэтым тыдні кампанія "СолМедыяГран" расставіла кропкі над "і", заявіўшы, што *"ў сувязі з тым, што суарганізатар першага беларускага нацыянальнага авіяшоу "Мінск Аэра-2008" — дабрачынны фонд "Памяць Афгана" — у аднабаковым парадку адмовіўся ад выканання сваіх абавязкаў па падрыхтоўцы гэтага мерапрыемства і ад прадастаўлення тэрыторыі гісторыка-культурнага комплексу "Лінія Сталіна" для правядзення авіяшоу, ЗАТ "Сол МедыяГран" са шкадаваннем вымушана канстатаваць, што авіяшоу не адбудзецца".*

Як заявіў Аляксандр Мятла, замест авіяшоу на "Лініі Сталіна" адбудзецца ваенна-спартыўнае свята.

"Нам вельмі хацелася зрабіць усё годна, — распавёў ён. — *Але час ішоў, а працы партнёраў не было бачна. "Витязей" няма, вядучага Леаніда Якубовіча няма, Іосіфа Кабзона і Льва Лешчанкі, як раней планавалася, няма... Кажуць: "Влада выступіць". Каму яна патрэбна, ваша Влада? Пра яе наогул гутарка не вялася. Адным словам, я так зразумеў, што хлопцы вырашылі зарабіць грошы. Але мы ў такіх сумніўных акцыях не ўдзельнічаем. Мы доўга зараблялі сабе добрае імя, і яно для нас больш дарагое, чым грошы".*

Алесь СІВЫ.

ФОТОРЕПОРТАЖ

«Белые Росы» спустя 15 лет

Под Минском сносят деревню Дружба. В 2010 году здесь начнется возведение нового микрорайона. Но местные жители о планах городских начальников практически ничего не знают. Им не известно даже то, где и как они будут жить в ближайшем будущем

Сюжет известного фильма "Белые Росы" помнят наверняка многие. Трогательная история небольшой белорусской деревушки, попавшей под бульдозер из-за близости к городу, равнодушным не оставляла никого. Спустя 25 лет похожую на Белые Росы деревушку мы отыскали под Минском.

...На столичном проспекте Дзержинского развернулась огромная стройка. С одной стороны идет строительство минского метро — сюда тянется первая линия метрополитена, чуть дальше, в "Малиновке", возводится новый жилой микрорайон. В этом же районе недалеко от главного корпуса Медуниверситета на прошлой неделе Александр Лукашенко заложил капсулу, свидетельствующую о начале строительства студенческой деревни. И среди этой стройплощадки, как сиротка, ютится улица Дружбы.

В дорожной пробке в районе Медуниверситета приходится стоять минут 15. Вырвавшись на свободу, сворачиваю на улицу Дружбы. И из шумного города, как по волшебству, попадаю в деревню, утопающую в зелени...

— Благодать тут у вас, — останавливаюсь у первого дома, на скамейке у которого под развесистой старой яблоней, спрятавшись от яркого солнца, сидят двое местных мужиков. Казалось бы, от шумного проспекта Дзержинского отъехала метров сто, не больше, но гула машин не слышно, и дышится по-другому.

— Говорят, ваша улица под снос пойдет, — пытаюсь разговорить "аборигенов", но им, изрядно принявшим на грудь, мои разговоры совсем не интересны. Решаю искать других собеседников. Но улица словно вымерла. Нигде ни души...

По обе стороны узкой неасфальтированной дороги стоят вперемешку старые деревянные дома и современные коттеджи. Последних, правда, немного. В основном постройки все старые, ветхие — типичные деревенские домики. И если бы не спутниковые антенны, торчащие едва ли не на каждой крыше, то и не поверил бы, что на улице XXI век и я нахожусь не где-нибудь, а на одной из улиц белорусской столицы.

Дружбе, выясню позже, лет 100. И некоторые домики с тех времен так тут и стоят, даже Великую Отечественную войну пережили. После войны деревня называлась менее красиво — Рыловщина — и относилась к колхозу имени Калинина. Но в конце прошлого века Минск стал подбираться и к колхозным землям, оттяпывая их понемногу. В 1998 году очередь дошла и до самой деревни, к тому времени уже переименованной в Дружбу. Местным жителям объявили, что они теперь минчане, и в паспорта поставили новые печати, свидетельствующие о том, что живут они в Минске на улице Дружбы.

— Вы только посмотрите на мою хату, — собеседница "нашлась" у колонки с водой. Лидия Цветкова охотно делилась со мной последними новостями: — Разве я могу не радоваться, что наконец-то перееду отсюда.

Лидия живет в Дружбе 39 лет. Дом у нее старый, покосившийся, без водопровода, газа и телефона. Собственно, телефонной линии в деревне никогда и не было. Сейчас местные жители пользуются мобильными телефонами. А раньше связь с цивилизацией помогал поддерживать телефон-автомат, установленный в начале улицы.

— А когда дома сносить-то будут? — интересуюсь я.

— А кто ж знает, — вздыхает женщина. — Мы знаем ровно столько, сколько по радио говорят. Никто к нам из исполкома не приезжал, не объяснял ничего. Мои дочери сами ездили в исполком, узнавали что к чему. Нас же в доме 9 человек прописано. Куда нас расселят? Как? Сказали, что меня как инвалида II группы отселять будут среди первых и дадут отдельную однокомнатную квартиру в "Малиновке" уже в конце этого года. А дочерей якобы на общую кухню поселят. Но нам подсказали, как надо оформить документы, чтобы у всех свое жилье было. Вот этим сейчас и занимаемся.

Городские власти планируют на месте бывшей деревни возвести новый микрорайон с жилыми домами, двумя автостоянками, школами и детскими садами. О грандиозных планах начальник отдела архитектуры и градостроительства администрации Московского района Ольга Верамей рассказала агентству "Минск-Новости". Только вот местных жителей пока с этими планами никто не ознакомил. И если Лидия Цветкова ждет не дождется прихода цивилизации в Дружбу, то ее соседи, которые живут побогаче, с грустью смотрят в будущее.

— Здесь же просто райский уголок, — говорит хозяйка одного из лучших домов Дружбы. — Воздух свежий, тишина, город рядом.

Елена с мужем построили небольшой двухэтажный дом в Дружбе 10 лет назад. Землю приватизировали. В прошлом году загорелись идеей построить баню и, когда ходили за разрешением в исполком, поинтересовались, пойдет ли под снос их улица. Вразумительного ответа они тогда не получили, зато разрешение на строительство бани им дали.

— Теперь вот с ужасом думаем, что все это пойдет под бульдозер, — вздыхает Елена. — Надежда у нас только на то, что недалеко от нас совсем недавно дом начал строить чиновник из исполкома. Может, часть улицы все же оставят, а снесут только дома, которые прилегают к проспекту Дзержинского.

Лидия Цветкова рассчитывает получить отдельную квартиру.

Елена, как и Лидия Цветкова, недоумевает: почему официально им никто ничего не говорит.

— Приезжали только из исполкома Московского района Минска и собирали данные о прописанных в домах жильцах, — рассказывает Елена. — На каких условиях нас собираются переселять, никто не комментирует. Мы сами ездили к юристам консультироваться. Они говорят, что по закону моей семье должны выделить равнозначный частный дом в черте города. На таких условиях мы бы еще переехали, а переселяться в квартиру не хотим. Но если заставят, мы же ничего поделать не сможем...

...В финале "Белых Рос" деревню сносят, герои фильма получают новые квартиры, привыкнуть к которым, судя по всему, вряд ли смогут. Что ожидает жителей Дружбы, покажет время, которое в белорусских деревнях словно замерло на месте...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.
Фото автора.

ПОЛЕЗНО ЗНАТЬ

Если ваш дом идет под снос

— По нашему законодательству гражданам, которых выселяют из жилых помещений, предоставляют помещения типовых потребительских качеств, — поясняет юрист Яна ПОЛЯКОВА. — К сожалению, нашим земельным и жилищным законодательствами понятие "типовые потребительские качества" не расширено. Но жители имеют право оценить свой дом и согласно этой оценке требовать новое жилье. Единственное, что оценивать жилище, которое идет под снос, надо не в БТИ по остаточной стоимости, а у эксперта по рыночной стоимости. Дело в том, что в нашей правовой базе есть один нюанс: согласно декретам и указам, дом изымается и оценивается по кадастровой стоимости, но тогда он будет стоить копейки. Но есть гражданское законодательство (Гражданский, Земельный и Жилищный кодексы), согласно которому жилье может быть оценено экспертом. Т.е. главенствующая роль отводится свободе договора.

В данной ситуации общего рецепта нет. Каждый случай надо рассматривать отдельно, потому что ситуации разные. У кого-то дом находится в частной собственности, но стоит на арендованной земле. У других наоборот — земля приватизирована, а дом не зарегистрирован. Но однозначно, что жители имеют право требовать равнозначное жилье, и все нюансы должны оговариваться сторонами, исходя из цены дома, цены участка, на котором он стоит, и квадратных метров дома. Если семья не нуждается в расширении, она может получить одну квартиру. А если нуждается, тогда государство должно предоставить гражданам недостающий метраж, либо отдельную квартиру, либо денежную компенсацию.

Абрабавалі ўдаву вядомага лётчыка

У Мінску абрабавалі ўдаву вядомага лётчыка, Героя Савецкага Саюза 87-гадовую Веру Маркіну. Злодзеі патрапілі ў яе кватэру, калі пенсіянерка была ў бальніцы. Грошы і каштоўнасці іх не цікавілі. Невядомыя забралі залатую зорку Героя Савецкага Саюза і ордэн Леніна.

РЭЙТЫНГ

Беларусь трапіла ў спіс недзеяздольных краін

Беларусь заняла 53-е месца з 60 недзеяздольных дзяржаў свету. Такая інфармацыя ўтрымліваецца ў адмысловым рэйтынгу, які ўжо чацвёрты год складаюць Цэнтр Карнегі і незалежная даследная арганізацыя Фонд міру.

Паводле даследчыкаў, недзеяздольная дзяржава — гэта дзяржава, на якую можа абрынуцца сур'ёзны крызіс. Фактары недзеяздольнасці — страта фізічнага кантролю над сваёй тэрыторыяй і дзяржаўнай манаполіяй на ўжыванне сілы, няздольнасць улад забяспечыць нармальнае функцыянаванне грамадства, а таксама няздольнасць узаемадзейнічаць з іншымі краінамі як паўнацэнны член міжнароднай супольнасці. Гэта не азначае, што дзяржава ўжо абрынулася, што яе няма, але гэта — паказчык яе крохкасці.

Эксперты двух амерыканскіх даследных цэнтраў прааналізавалі сітуацыю ў 177 краінах свету паводле 12 індыкатараў. 60 краін, якія замыкаюць спіс, — якраз тыя, якія, паводле аўтараў даклада, можна ахарактарызаваць як недзеяздольныя.

Пачынаюць спіс афрыканскія краіны Самалі, Судан і Зімбабве. У Самалі працягваецца шматгадовая грамадзянская вайна з удзелам арміі суседняй Эфіопіі, толькі летась і толькі сталіцу Магадыша пакінулі 700 тысяч уцекачоў. Судан вядомы ва ўсім свеце сапраўдным генацыдам, які адбываецца ў правінцыі Дарфур. У Зімбабве акрамя жахлівых парушэнняў правоў чалавека і нахабных фальсіфікацый выбараў — інфляцыя 150.000 (!) працэнтаў за год.

Таксама вельмі нізка эксперты ацэньваюць іракскую дзяржаву.

Зразумела, не ва ўсіх дзяржавах, што патрапілі ў шасцідзесятку найгоршых, сітуацыя такая, як у Самалі ці Судане, скажам, на 58-м месцы апынуўся Ізраіль з прычыны няздольнасці інтэграваць арабскую меншасць і глыбокага расколу эліты.

Пераважную большасць краін недзеяздольнай шасцідзесяткі складаюць краіны Афрыкі (і амаль усе краіны гэтага кантыненту ў гэты "чорны" спіс трапляюць). З постсавецкіх краін у спісе — дзяржавы Цэнтральнай Азіі — Узбекістан (26), Таджыкістан (38), Кыргызстан (39), Туркменістан (46) , Малдова (49), Грузія (56) і Беларусь — 53-е месца.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.

ГРОМКАЯ ТЕМА

Светлана ЗАВАДСКАЯ:

«Чуда не произошло...»

Вдова насильственно похищенного оператора ОРТ Дмитрия Завадского Светлана подала заявку в Мингорисполком на проведение 7 июля пикета, приуроченного к очередной годовщине исчезновения Дмитрия Завадского.

А на днях суд Московского района Минска отказал Светлане Завадской в удовлетворении ее жалобы на неправомерные действия заместителя председателя Мингорисполкома Михаила Титенкова, который запретил проведение пикета 7 мая, в годовщину исчезновения экс-министра внутренних дел Беларуси Юрия Захаренко.

Напомним, что целью пикета должно было стать привлечение внимания общественности к требованиям о реальном расследовании дел пропавших публичных людях Беларуси, а также к требованию принятия и ратификации Республикой Беларусь Международной конвенции о защите всех лиц от насильственных исчезновений.

— Меня не удивило это решение, я была к нему готова, — сказала "Народной воле" Светлана Завадская. *— Белорусская власть уже много лет как огня боится темы насильственных исчезновений известных людей. И для того, чтобы портреты пропавших не мелькали где-то вблизи государственных учреждений, Национального собрания, резиденции президента, они сделали и делают все, чтобы любыми способами запретить проведение подобных мирных акций, не смущаясь, что при этом нарушают те права, которые гарантирует нам Конституция Республики Беларусь.*

Но я не собираюсь на этом останавливаться и обязательно буду обжаловать решение судьи Елены Черняк в вышестоящих инстанциях. Более того, мной сразу была подана очередная заявка в Мингорисполком на проведение пикета 7 июля 2008 года в годовщину исчезновения Дмитрия Завадского на площади Свободы около Ратуши.

ЛИЧНОЕ ДЕЛО

Дмитрий Завадский родился 28 августа 1972 года.

С 1994-го по 1997 год — личный оператор А.Г.Лукашенко.

С января 1997 года — оператор Общественного российского телевидения (ОРТ).

Весной 1997 года был арестован вместе с журналистом ОРТ Павлом Шеремотом за репортаж о прозрачности белорусско-литовской границы и условно осужден на полтора года лишения свободы.

С октября 1999-го по май 2000 года работал в Чечне, где вместе с Павлом Шеремотом снимал для ОРТ фильм "Чеченский дневник".

7 июля 2000 года исчез при невыясненных обстоятельствах по дороге в аэропорт "Минск-2".

Похищение Дмитрия Завадского официально считается раскрытым. 4 октября 2001 года Минский областной суд начал слушания по делу о похищении Д.Завадского. Судебный процесс был объявлен закрытым и проводился в помещении Верховного Суда. Председательствовал на процессе судья Минского областного суда Александр Симонов.

Виновными в похищении Завадского были признаны офицеры спецподразделения МВД "Алмаз" Валерий Игнатович и Максим Малик (приговорены к пожизненному заключению), бывший курсант Академии МВД Алексей Гуз (приговорен к 25 годам лишения свободы), а также ранее трижды судимый гражданин Сергей Савушкин (уже вышел на свободу). Все приговоры были вынесены судом в закрытом порядке. Однако ни один из них своей вины не признал. Тело Дмитрия Завадского до сих пор не обнаружено.

Журналист Павел Шеремет за два дня до начала суда по делу Завадского устроил пресс-конференцию в Москве, на которой высказал свою версию: банда Игнатовича если и причастна к похищению его оператора, то только в качестве исполнителя чужой воли. Вероятным заказчиком преступления Шеремет назвал нынешнего генпрокурора Беларуси Виктора Шеймана. В организации устранения Д.Завадского общественность подозревает также экс-главу МВД Ю.Сивакова и командира воинской части 3214 Д.Павличенко.

Марина КОКТЫШ.

ДЫПКУР'ЕР

Запрацаваў консульскі аддзел пасольства Венгрыі

Пасольства Венгрыі ў Беларусі пачало прыём заяў ад беларускіх грамадзян, якія жадаюць наведаць Венгрыю.

Як паведаміў намеснік кіраўніка венгерскай дыпламатычнай місіі -- консул Ласла Дароцы, праца па прыёме віз пачалася 16 чэрвеня. Прыёмныя дні ў пасольстве -- панядзелак, аўторак і чацвер. З 9.00 да 12.00 прымаюцца заявы на выдачу кароткатэрміновых віз, з 14.00 да 16.00 -- віз для працяглага знаходжання і групавых (ад пяці чалавек). Чаканы тэрмін разгляду заяў, паводле слоў Л.Дароцы, складае мінімум 10 дзён. Да гэтага часу ўжо прыняты да разгляду больш як трыццаць заяў.

21 снежня 2007 года Венгрыя далучылася да Шэнгенскага пагаднення. Кошт шэнгенскай візы складае 60 еўра.

Ірына САЗАНОВІЧ.

ПАЛІТКУХНЯ

Калі Мінюст усё ж такі зарэгіструе рух Аляксандра Мілінкевіча?

Міністэрства юстыцыі ў трэці раз адмовіла ў рэгістрацыі праваабарончага грамадскага аб'яднання "Рух "За Свабоду".

Як паведаміў БелаПАН намеснік кіраўніка аргкамітэта ствараемага руху Юрый Губарэвіч, Мінюст палічыў, што дзейнасць аб'яднання не будзе адпавядаць заяўленым у статуце мэтам.

"У лісце чыноўнік міністэрства аналізуе выступленні і публічныя заявы Аляксандра Мілінкевіча і іншых прадстаўнікоў руху. У выніку ён прыходзіць да высновы, што рэальныя мэты стварэння і дзейнасці аб'яднання не адпавядаюць заяўленым у статуце. Рэальнымі называюцца палітычныя, а не праваабарончыя мэты стварэння руху. А рэальныя мэты, лічаць яны, не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства", — зазначыў Ю.Губарэвіч.

Апрача таго, Мінюст звяртае ўвагу, што ў гарантыйным лісце ад прадпрыемства, якое гатова даць юрыдычны адрас руху, у яго назве адсутнічае слова "грамадскі". Ю.Губарэвіч паведаміў, што з гэтага міністэрства робіць выснову: дакумент гарантуе прадастаўленне юрыдычнага адраса для іншай арганізацыі.

Рашэнне Міністэрства юстыцыі будзе абскарджана ў Вярхоўным судзе. У выпадку, калі яно будзе пакінута ў сіле, магчыма чацвёртая спроба рэгістрацыі руху "За Свабоду".

Нагадаем, што 23 красавіка Міністэрства юстыцыі Беларусі адклала рэгістрацыю праваабарончага грамадскага аб'яднання "Рух "За Свабоду" ў сувязі з прэтэнзіямі да графічнага афармлення лагатыпа аб'яднання, а таксама неадпаведнасцю платформы руху, размешчанай на сайце Аляксандра Мілінкевіча, пададзенага для рэгістрацыі статута.

Гэта была трэцяя спроба зарэгістраваць арганізацыю. Дагэтуль двойчы — у ліпені і кастрычніку 2007 года — Мінюст адмаўляў у рэгістрацыі руху. Афіцыйнымі прычынамі былі прэтэнзіі да фармулёвак статута, а таксама той факт, што адна з устаноўчых канферэнцый аб'яднання праводзілася з парушэннямі Закона "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь". Аргкамітэт спрабаваў апратэставаць рашэнні Мінюста ў Вярхоўным судзе, але безвынікова.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

АФІЦЫЙНА

Трапіць у Расію будзе прасцей

Дзяржаўны мытны камітэт Беларусі і Федэральная мытная служба Расіі падпісалі пратакол, згодна з якім беларусы атрымаюць магчымасць афармлення шматразовага пасведчання на часовы ўвоз аўтатранспарту на тэрыторыю Расіі тэрмінам да паўгода.

Цяпер беларускія грамадзяне афармляюць пасведчанне часовага ўвозу транспартных сродкаў кожны раз пры ўездзе на тэрыторыю Расіі на расійскай мытні. Такім чынам, у выніку дасягнутых дамоўленасцяў колькасць зваротаў беларусаў па афармленне пры ўездзе ў Расію будзе скарочана.

Гэта норма магла б ужо дзейнічаць, аднак расійскаму боку спатрэбіўся некаторы час, каб падрыхтаваць і прыняць адпаведны нарматыўна-прававы акт. На працягу месяца такая магчымасць у беларусаў з'явіцца, сказаў старшыня ДМК Беларусі Аляксандр Шпілеўскі.

СУД

Слонімскі афіцэр заплаціць 7 мільёнаў за лячэнне салдата

7 мільёнаў рублёў заплаціць за лячэнне салдата афіцэр адной са слонімскіх вайсковых часцей.

Акрамя таго, Міжгарнізонны ваенны суд абмежаваў яго ў адносінах да вайсковай службы тэрмінам на 1 год.

Нагадаем, няшчасны выпадак адбыўся з адным са слонімскіх вайскоўцаў на палігоне ў Баранавіцкім раёне. Салдат тэрміновай службы ў спякотны дзень адпіў з немаркіраванай бутэлькі з-пад напою... электраліт для акумулятара. Гэта выклікала хімічныя апёкі страўніка. У выніку пацярпелы быў камісаваны з войска па стане здароўя. А афіцэра пакаралі за неахайнае захоўванне той самай вадкасці, якая нанесла шкоду здароўю маладога хлопца.

ПАРТРЭТНАЯ ГАЛЕРЭЯ

Валянціна СВЯЦКАЯ:

«Прынцып "Паслухай жанчыну і зрабі наадварот" на мяне не распаўсюджваецца»

Жанчына ў палітыцы. Для беларускага грамадства гэта даволі рэдкая з'ява. У нас да жанчын-палітыкаў ставяцца насцярожана, а часам бывае і непрымальна. Тым не менш, як паказвае сусветная гісторыя, "жалезныя ледзі" часта аказваюцца больш паспяховымі і папулярнымі палітыкамі, чым мужчыны.

У чым сакрэт, спецыфіка і складанасці працы жанчыны-палітыка — тэма нашай размовы са старшынёй Жаночай камісіі Партыі БНФ, паспяховым палітыкам і абаяльнай жанчынай Валянцінай Свяцкай.

— Спадарыня Валянціна, вы даўно ў палітыцы і, падаецца, упэўнена сябе адчуваеце. Але ж на сённяшні дзень быць жанчынай і займацца палітыкай нараўне з мужчынамі, тым больш з'яўляцца апазіцыйным палітыкам, у Беларусі вельмі няпроста. Ці не так?

— У постсавецкіх краінах ёсць пэўныя складанасці для жанчыны, калі яна трапіць у палітыку, пры тым што ў еўрапейскіх краінах гэта ўспрымаецца як дадзенасць часу. Ёсць нават жанчыны, якія ўзначальваюць міністэрствы абароны, унутраных спраў і не горш за мужчын спраўляюцца з гэтымі абавязкамі. А ў Беларусі яшчэ з царскіх часоў захаваліся прынцыпы дамастрою, які абмяжоўвае дзейнасць жанчыны дзецьмі, царквой і кухняй. Гэта ментальнасць нашых мужчын была ў савецкія часы, засталася і цяпер.

А наконт жанчыны ў палітыцы ў нас яшчэ існуе стэрэатып, што трапіць туды яна можа, знаходзячыся за нечымі шырокімі плячыма. А калі жанчына самастойная і паказвае, што спраўляецца са сваімі абавязкамі не горш за мужчын, то гэта выклікае скепсіс а то і адмоўную рэакцыю ў мужчын і, што самае дзіўнае, часам і ў жанчын.

Што тычыцца жанчын, якія сёння ў апазіцыі, то я магу пра іх шмат чаго добрага сказаць, таму што гэта вельмі мужныя і разумныя жанчыны. Іх знаходжанне ў дэмакратычным асяроддзі робіць яго больш прывабным. І адносіны да жанчын у дэмакратычным асяроддзі больш паважлівыя, найперш таму, што сапраўды займацца апазіцыйнай палітыкай у Беларусі небяспечна.

— Вы лідэр Жаночай камісіі Партыі БНФ. З якой мэтай яна стваралася?

— Камісія складаецца з палітычна і грамадска актыўных жанчын, якія могуць зрабіць нешта карыснае для нашага грамадства і нічога не баяцца. Мы лічым, што сёння ў палітыцы мала жанчын і іх трэба ўцягваць у гэта кола. Таму што, калі жанчына прыходзіць у палітыку, яна больш адказная і працавітая, чым мужчыны. Да таго ж, калі трапляеш у партыйнае кола, атрымліваеш больш шанцаў на рэалізацыю сваіх магчымасцяў. І асабліва важна, калі ты разам з палітычнай партыяй трапляеш у нейкае кола ўлады — парламент ці выканаўчыя структуры. У такім выпадку ты не сам-насам, а за табой стаіць партыя, якая табе можа прапанаваць спецыялістаў, экспертаў, падрыхтаваць нейкую праграму і нават законапраекты. У Партыі БНФ еўрапейскі выбар і еўрапейскія каштоўнасці нам блізкія. Таму мы лічым, што наша партыя павінна быць калі не з жаночым тварам, то ў ёй павінны быць жанчыны, якія будуць уплываць на палітыку, разам з тым і ў партыі.

— Настолькі актыўных і дзейсных жанчын часта папракаюць фемінізмам. А мужчыны ў іх бок кідаюць сакраментальнае: "Паслухай жанчыну і зрабі наадварот". Вам гэта не замінае?

— У фемінізме я нічога дрэннага не бачу. Проста лічу, што трэба захоўваць гендэрны баланс. І трэба ўлічваць, што мы, жанчыны, сапраўды можам многае зрабіць. Жанчыны прыходзяць у палітыку, менавіта каб нешта зрабіць, а мужчыны ў палітыцы самасцвярджаюцца. І мне шкада, калі я сустракаю часам, нават і ў дэмакратычным асяроддзі, мужчынскае эга. Калі ён сваё меркаванне ставіць вышэй за жаночае і выказваецца пагардліва. Я тады падкрэсліваю, што з'яўляюся не проста жанчынай, а апаратчыцай, таму прынцып "Паслухай жанчыну і зрабі наадварот" на мяне не распаўсюджваецца. І мужчыны, якія працуюць разам са мной, гэтым выслоўем не карыстаюцца, бо ведаюць, што гэта небяспечна — я магу "даць здачы".

— Хто з сусветна вядомых жанчын-палітыкаў вам найбольш падабаецца?

— Найперш Юлія Цімашэнка і яшчэ Ніно Бурджанадзе. Маленькая, прыгожая Юлія столькі вытрымлівае на сваіх плячах! Калі б на яе плявузгалі толькі мужчыны, якія побач, ва Украіне, гэта было б яшчэ нічога. Там яна даўно адстаяла сваё права мець уласнае меркаванне. Але калі я бачу, як усе расійскія СМІ, якія дагэтуль закрываюць украінскую інфармацыйную прастору, льюць на яе бруд, мне робіцца брыдка. І мне цікава, ці не сорамна было Пуціну глядзець у вочы гэтай жанчыне падчас сустрэчы на саміце кіраўнікоў урадаў, таму што траўля Цімашэнкі была санкцыянаваная Крамлём. І ці не сорамна беларускім дзяржаўным СМІ аблiваць яе брудам? Хай бы паспрабавалі сказаць нешта падобнае ў адрас Наталлі Пяткевіч. Баяцца! А маленькая Цімашэнка насамрэч вялікая "глыба", якая, нягледзячы ні на што, пракладвае сабе дарогу. Тое ж тычыцца і Ніно Бурджанадзе.

— Яны абедзве з'яўляюцца прадстаўніцамі кіруючай улады. А што вы можаце сказаць пра апазіцыйнага палітыка Ірыну Хакамаду?

— У свой час мне падабаліся некаторыя яе палітычныя дзеянні. І я з задавальненнем глядзела тэлеперадачу "К барьеру", дзе яна праводзіла дыялогі, інтэлектуальныя дуэлі з мужчынамі. Яна не аднаго ўзроўню з тымі мужчынамі, бо значна мацнейшая за іх і больш адукаваная.

— Вы палітык, але найперш жанчына. Як адбіваецца ваша палітычная заангажаванасць на асабістым жыцці?

— Мне даводзіцца калі-нікалі паступацца не толькі сваімі прынцыпамі, але і асабістым жыццём. Таму я не ўзор жанчыны ў палітыцы. Калі б я не трапіла ў палітыку, маё жыццё склалася б інакш. Але я ні пра што не шкадую. Ніколі нельга шкадаваць па раней прынятым рашэнні, нават калі яно няправільнае, бо гэта прыгнятае.

— А якой, на вашу думку, павінна быць сучасная жанчына: моцнай, незалежнай, упэўненай у сабе ці мяккай і памяркоўнай?

— Трэба быць мудрай і калі-небудзь незалежнай, а калі-небудзь і мяккай. У жанчын і ў мужчын я найперш цаню інтэлект. І мне вельмі не хацелася б, каб было ў нас, як сказаў нехта з вядомых мужчын: "Цяпер час мужных жанчын і жаноцкіх мужчын". Таму што калі прырода стварыла мужчын і жанчын і ўсклала на іх адпаведныя абавязкі і надала ім пэўныя ўласцівасці, трэба гэтаму адпавядаць. Мужчынам павінна быць уласціва мужнасць, а жанчынам — жаноцкасць.

Наталля ЯКАВЕНКА.

ДАВЕДКА

Валянціна Свяцкая нарадзілася ў Казахстане. Першае знаёмства з радзімай бацькоў — Беларуссю — адбылося, калі яна была ўжо школьніцай. У 1981 годзе Валянціна пераехала ў Беларусь. Працавала на Мінскім трактарным заводзе: аператарам ЭВМ, інжынерам-праграмістам, намеснікам сакратара камітэта камсамола, інструктарам парткама і загадчыцай кабінета палітасветы; інструктарам у Мінскім гарадскім камітэце КПБ; пасля прыпынення дзейнасці кампартыі — у камерцыйных структурах на розных пасадах; рэферэнтам, сакратаром савета Аграрнай партыі Беларусі; кіраўніком Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання.

Валянціна Свяцкая — сябра Партыі БНФ з 2004 года. Уваходзіць у склад планава-аналітычнай групы АДС. Старшыня Жаночай камісіі Партыі БНФ. Удзельнічала ў выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у якасці кандыдата ў дэпутаты.

ЧУЛІ?

Павялічаны цэны на цукар

Цукар стаў даражэйшым на 5%. Павышэнне цэн ініцыяваў канцэрн "Белхарчпрам", а Міністэрства эканомікі толькі пагадзілася з прапановай.

Згодна з пастановай міністэрства, з 20 чэрвеня рознічная цана на цукар-пясок складае 1840 рублёў за кілаграм, цукар, расфасаваны ў цэлафанавыя ці папяровыя пакеты, каштуе 2 тысячы рублёў за кілаграм.

Са сваёй "добрай навіной" чыноўнікі падаспелі акурат да з'яўлення першых ягад.

НУ І НУ!

У Акадэміі навук не ведаюць гісторыю бел-чырвона-белага сцяга

Міністэрства культуры адхіліла прапанову Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры аб наданні бел-чырвона-беламу сцягу статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Пра гэта БелаПАН паведаміў старшыня таварыства Антон Астаповіч. У офіс таварыства паступіла адпаведная выпіска з пратакола пасяджэння Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры за подпісам намесніка міністра Уладзіміра Грыдзюшкі. Сваю пазіцыю члены рады матывавалі *"недастатковай аргументаванасцю і дакументальнай абгрунтаванасцю"* прапановы грамадства. Акрамя таго, зазначаецца ў дакуменце, ёсць заключэнні Інстытута гісторыі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, *"якія сведчаць пра неадпаведнасць пададзеных матэрыялаў прававым нормам і няўвучанасць гісторыі гэтага пытання"*.

А.Астаповіч назваў рашэнне рады чаканым. Пры гэтым ён падкрэсліў, што заяўка на наданне бел-чырвона-беламу сцягу статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці была афармлена ў адпаведнасці з заканадаўствам. *"Пакуль існуе цяперашняя сістэма ўлады, пры якой чыноўнікі любой сферы, у тым ліку навукі і культуры, баяцца самастойна прымаць любое рашэнне, не будзе падтрымана ніводная падобная ініцыятыва грамадскасці"*, — лічыць А.Астаповіч.

Бел-чырвона-белы сцяг з 1991-га па 1994 год быў адным з сімвалаў беларускай дзяржаўнасці, а бел-чырвона-белыя стужкі з'яўляюцца элементамі сімволікі зарэгістраванага грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" і Беларускага экзархату Рускай праваслаўнай царквы. Некалькі гадоў таму герб "Пагоня" быў уключаны ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Марат ГАРАВЫ.

РЭГІЁН

Верхнядзвінскія начальнікі кінулі паліць

Верхнядзвінскі раённы Савет дэпутатаў вырашыў забараніць паленне ў грамадскіх месцах і стымуляваць фінансава тых, хто адмовіўся ад тытуню.

Пра гэта былі інфармаваныя кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, аднак першымі кінулі паліць амаль усе супрацоўнікі райвыканкама, у тым ліку першыя асобы. Дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БЕЛТА ўдакладніла, што са 100 чыноўнікаў і персаналу выканкама цяпер паляць толькі 2 чалавекі.

У Пінску будзе «водная міліцыя»

"Водную міліцыю" арганізуюць у Пінску. Яна мусіць дапамагчы ў змаганні з п'янымі дэбашырамі на гарадскіх пляжах.

Як аказалася, традыцыйныя пешыя міліцэйскія патрулі на пляжах выявіліся немабільнымі. А выратавальная служба на вадзе не мае паўнамоцтваў "для папярэджвання правапарушэнняў". Таму было вырашана рабіць супольнае патруляванне. У патруль водных выратавальнікаў дадаюцца два міліцыянты. Такі патрульны катэр будзе працаваць у Пінску ўвесь купальны сезон.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.

Чаму «народная ўлада» не прапаноўвае народу «Белтрансгаз»?

Аперацыя па знішчэнні палонных пачала рыхтавацца яшчэ ў лютым 1940 года. Справы былых афіцэраў і жандармаў павінна была разгледзець Адмысловая нарада пры НКУС. А 5 сакавіка наркам Лаўрэнцій Берыя прапанаваў Палітбюро: "Справы аб змешчаных у лагерах ваеннапалонных — 14.700 чалавек былых польскіх афіцэраў, чыноўнікаў, памешчыкаў, паліцэйскіх, разведчыкаў, жандармаў, асаднікаў і турэмшчыкаў, а таксама справы аб арыштаваных і змешчаных у турмы заходніх абласцей Украіны і Беларусі ў колькасці 11.000 чалавек былых памешчыкаў, фабрыкантаў, былых польскіх афіцэраў, чыноўнікаў і перабежчыкаў — разгледзець у адмысловым парадку, з ужываннем да іх вышэйшай меры пакарання і расстрэлу".

У той жа дзень Палітбюро пагадзілася з довадамі наркама: "Справы разгледзець у адмысловым парадку, з ужываннем да іх вышэйшай меры пакарання — расстрэлу. Разгляд справы правесці без выкліку арыштаваных і без прад'яўлення абвінавачвання, пастановы аб канчатку следства і абвінаваўчага зняволення". Выжыць атрымалася толькі 400 вязням: кагосьці з іх намерваўся выкарыстаць у сваіх агентурных гульнях НКУС, за кагосьці прасілі ўплывовыя еўрапейскія грамадскія і палітычныя дзеячы.

У канцы сакавіка НКУС скончыў распрацоўку плана па вываз вязняў лагераў і турмаў да месцаў расстрэлу. Зняволеных з усіх украінскіх турмаў везлі на расстрэл у Кіеў, Харкаў і Херсон, з беларускіх — у Мінск. Для знішчэння насельнікаў Асташкоўскага лагера прыгатавалі Калінінскую турму, загадзя вызваленую ад "старонніх" зэкаў. Адну з камер абшылі лямцом, каб не былі чутныя стрэлы. Аднасакова непадалёк ад Калініна, у пасёлку Меднае, экскаватары вырылі некалькі велізарных ям.



Такія ж ямы выкапалі і побач з Катынню, непадалёк ад Смаленска. З пачатку красавіка ваеннапалонных — палякаў, беларусаў, украінцаў і габрэяў — пачалі вывозіць на расстрэл эшалонамі па 350—400 чалавек. Каб усыпіць пільнасць ахвяраў, ім паведамілі, што хуткім часам іх адправяць на радзіму. Падзеі тых дзён апісаны ў дзённіку 32-гадовага паручыка Вацлава Крука. "7 красавіка. Спосаб адпраўкі ўсяляе лепшыя надзеі. Раніцай я памыўся ў лазні і памыў шкарпэткі і хустачкі. 8 красавіка. На станцыі пад строгім канвоем нас пагрузілі ў турэмныя вагоны. Калі раней я быў наладжаны аптымістычна, то зараз ад гэтага вандравання не чакаю нічога добрага. 9 красавіка. Трымаюцца з намі кепска. Не дазваляюць нічога. Выйсці ў туалет можна толькі тады, калі гэта ўздумаецца канваірам. Са ўчарашняга дня жывём порцыяй хлеба і воды". На гэтым запісы, знойдзеныя на целе забітага афіцэра, абрываюцца.

З пачатку красавіка да сярэдзіны мая 1940 года былі пакараны больш за 20 тысяч чалавек. З іх у Катыні — больш за 4 тысячы. Палякаў расстрэльвалі з 7,65-міліметровых пісталетаў германскай вытворчасці, прададзеных у 20-х гадах Польшчы, а затым захопленых у верасні-кастрычніку 1939 года савецкімі войскамі. Аб расстрэлах у Калініне следчым ваеннай пракуратуры, якія расследавалі гэтае злачынства, распавёў былы начальнік абласнога кіравання НКУС Токараў. Палякаў вялі ў адмысловы пакой, стралялі ў патыліцу і ў крытай машыне адвозілі трупы ў Меднае. Кіравалі "разгрузкай" начальнік штаба канвойных войскаў Крывенка і начальнік кашталянскага аддзела НКУС Блохін. Перад расстрэлам ён апранаў скураныя фартух, крагі і кепку, чым уразіў нават Токарава. "Я ўбачыў сапраўднага ката", — распавёў ён следчым. Пасля расстрэлаў у Маскву адправілі тэлеграму: "Аперацыя па разгрузцы лагераў скончана".

"Разгрузка лагераў" супала па часе з нацысцкай аперацыяй па знішчэнні эліты ў самой Польшчы. 30 мая, праз тры тыдні пасля пачатку германскага наступу ў Заходняй Еўропе, гітлераўскі генерал-губернатар Польшчы Франк заявіў: "Мы павінны выкарыстаць момант, што прадставіўся. Мы абавязаны думаць аб тым, каб за кошт нямецкіх ахвяраў не паднялася польская нацыя. Я цалкам адкрыта прызнаю: гэта будзе каштаваць жыцця некалькім тысячам палякаў, першым чынам з кіруючага пласта польскай інтэлігенцыі.

Фюрэр выказаўся так: "Тое, што мы вызначылі як кіруючы пласт у Польшчы, трэба ліквідаваць". Рэалізацыяй прапаноў Гітлера на практыцы займаліся СС і гестапа. Арышты польскай інтэлігенцыі, названыя "акцыяй АБ", пачаліся 1 сакавіка. Як паведамляў 1 чэрвеня 1940 года ў Берлін брыгадэнфюрэр СС Штрэкенбах, да канца мая былі арыштаваны каля 3 тысяч палякаў. Усе яны атрымалі смяротныя прысуды нацысцкіх ваенна-палявых судоў. Акрамя таго, гестапа планавала арышты яшчэ 2 тысяч чалавек.

Спрабуючы замесці сляды, НКУС рабіў усё, каб месцы расстрэлаў засталіся невядомымі. Да Меднага нямецкія войскі не дайшлі. Пахаванні пад Харкавам не былі вызначаныя як польскія — акрамя палонных палякаў НКУС расстраляў яшчэ і дзесяткі тысяч савецкіх грамадзян. Аднак у красавіку 1943 года рэшткі польскіх палонных пад Катынню былі выяўлены акупацыйнымі войскамі. Агледзець трупы немцы запрасілі экспертаў з ліку польскіх медыкаў, экспертаў і журналістаў з нейтральных краін і ваеннапалонных войскаў ЗША, Вялікабрытаніі і Канады.



"Целы, вымаемыя з равоў, складаліся шэрагамі на зямлю. Амаль кожнае цела, як правіла, было злеплена з іншымі трупнай жыжай, ліпкай, страшнай, смуроднай, не магло быць і гаворкі аб тым, каб расшпільваць кішэні, не кажучы ўжо аб сцягванні ботаў. Адмысловыя працоўныя ў прысутнасці дэлегата польскага Чырвонага Крыжа разразалі нажамі кішэні і халявы ботаў, бо ў іх таксама знаходзілі схаваныя рэчы", — пісаў пасля адзін з польскіх экспертаў Юзэф Мацкевіч.

Па абрыўках газет і лістоў, што захаваліся на мёртвых целах, якія датаваліся не пазней чым красавіком 1940 года, сябры камісіі прыйшлі да высновы, што палонныя былі расстраляны НКУС. Германская прапаганда адразу ж распавяла свету аб "зверствах бальшавікоў", маючы канчатковай мэтай занесці раскол у антыгітлераўскую каліцыю.

Для яе дасягнення нацысты завысілі колькасць забітых у Катыні: замест 4,5 тысячы яны назвалі лічбу 10—12 тысяч. Пасля гэтага польскі ўрад у эміграцыі, узначалены генералам Уладзіславам Сікорскім, запатрабаваў у Масквы тлумачэнняў. Сталін у адказ заявіў, што ён "не толькі не даў адпору подламу фашысцкаму паклёпу, але нават не злічыў патрэбным звярнуцца да савецкага ўрада з якімі-небудзь пытаннямі", а затым, абвінаваціўшы Сікорскага ў змове з немцамі, вырашыў перапыніць адносіны з эміграцкім урадам Польшчы.

Адразу пасля вызвалення Смаленска восенню 1943 года ў Катыні быў усталяваны плакат: "Тут, у Катынскім лесе, восенню 1941 года расстраляны гітлераўскімі катамі 11.000 ваеннапалонных польскіх салдат і афіцэраў. Воін Чырвонай Арміі, адпомсці!"

У студзені 1944 года ў Катыні пачала працаваць камісія пад старшынствам акадэміка Мікалая Бурдэнкі. У яе склад увайшлі пісьменнік Аляксей Талсты, мітрапаліт Мікалай, замнаркама замежных спраў Уладзімір Пацёмкін, прадстаўнікі войска і НКУС. Ужо 24 студзеня камісія зрабіла выснову, што палякаў расстралялі немцы, а затым гітлераўская прапаганда, падтасаваўшы факты, паспрабавала пасварыць польскі і савецкі народы. Гэтая версія і была прадстаўлена савецкай дэлегацыяй на Нюрнбергскім працэсе. Тады саюзнікі ўпадабалі не сварыцца з Савецкім Саюзам і не ўнялі настойлівым просьбам польскай грамадскасці запатрабаваць у Масквы аб'ектыўнага расследавання падзей у Катыні.

3 сакавіка 1959 года, у службовай запісцы першаму сакратару ЦК КПСС Мікіту Хрушчову старшыня КДБ Аляксандр Шалепін пісаў: "Паводле высноў камісіі Бурдэнкі ўсе ліквідаваныя там (у Катыні) палякі лічацца знішчанымі нямецкімі акупантамі. Матэрыялы расследавання шырока асвятляліся ў савецкім і замежным друку. Высновы камісіі ўмацаваліся ў міжнароднай грамадскай думцы. Выходзячы з выкладзенага, уяўляецца мэтазгодным знішчыць усе ўліковыя справы на асоб, расстраляных у 1940 годзе па паказанай вышэй аперацыі. Па аб'ёме гэтыя дакументы малаважныя і захоўваць іх можна ў адмысловай папцы".

З тых часоў са зместам гэтай папкі пасля ўступлення ў пасаду знаёміліся ўсе без выключэння генеральныя сакратары — ад Брэжнева да Гарбачова. Аднак нават "бацька перабудовы" доўга адмаўляўся прызнаць факт дачынення да катынскага расстрэлу савецкіх спецслужб. Толькі ў 50-я ягоныя ўгодкі Гарбачоў схіліў калені перад закладным каменем мемарыяла ахвярам Катыні і заявіў, што ў трагедыі вінаваты НКУС.

Гістарычная праўда была адноўлена ў кастрычніку 1992 года, калі камісія па рассакрэчванні архіваў ЦК, узначаленая гісторыкам Зміцерам Ваўкагонавым і міністрам друку Міхасём Палтараніным, апублікавала запіску наркама ўнутраных спраў Лаўрэнція Берыі ў ЦК з праектам пастановы Палітбюро і саму пастанову. Нягледзячы на тое, што знайшліся гісторыкі, якія аспрэчылі сапраўднасць гэтых дакументаў і заявілі, што яны былі сфабрыкаваны ў 1991—1992 гадах "дэмакратычнымі неагебельсаўцамі", чарговая спроба скласці са сталінскага палітбюро адказнасць за гэтае злачынства не атрымалася. На тое, што менавіта ягоныя члены адным росчыркам пяра адправілі на смерць больш за 20 тысяч чалавек, паказвае цэлы шэраг дакументаў.

Цяпер у Катынскім лесе ўзвядуць мемарыял ахвярам расстрэлу. Яго стваральнікі спадзяюцца, што ён можа паслужыць справе прымірэння двух народаў.

Усяго ў гэтай справе 183 тамы, з якіх 116 утрымліваюць звесткі, складаючыя дзяржаўную тайну. Пастанова аб спыненні крымінальнай справы ў адносінах да вінаватых асоб таксама носіць сакрэтны характар. Справа была спыненая ў сувязі са смерцю вінаватых.

Паводле падпісанага ў 1995 годзе пратаколу паміж Украінай, Расіяй, Беларуссю і Польшчай, кожная з гэтых краін самастойна расследуе злачынствы, здзейсненыя на іх тэрыторыі. Беларусь і Украіна падалі расійскаму боку свае даныя, якія былі выкарыстаны пры падвядзенні вынікаў расследавання Галоўнай ваеннай пракуратуры РФ.

У 2005 годзе "катынская справа" было спынена, галоўная ваенная пракуратура Расіі не выявіла генацыду ў адносінах да польскіх грамадзян. Ніводны са сваякоў загінуўшых польскіх афіцэраў не быў прызнаны пацярпелым.

ПРЭМ'ЕРА

Праўда пра Хатынь

Прэм'ера 35-хвіліннага дакументальнага фільма "Праўда Хатыні", прысвечанага трагедыі вёскі Хатынь Лагойскага раёна Мінскай вобласці, спаленай разам з жыхарамі 22 сакавіка 1943 года, адбылася ў Мінску.

Як паведаміў БелаПАН кансультант фільма, кандыдат гістарычных навук Ігар Кузняцоў, стужка абвяргае цяперашнюю афіцыйную версію аб тым, што Хатынь была спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Паводле яго слоў, у фільме прыводзяцца факты, якія бясспрэчна сведчаць аб тым, што катамі Хатыні з'яўляюцца калабаранты з 118-га паліцэйскага батальёна. *"У стужцы прадстаўлены шэраг праблем, што выходзяць за межы трагедыі вёскі, у тым ліку пытанне здрадніцтва. Бо спальванне вёскі праводзілася выключна рукамі нашых былых суграмадзян па загадзе нацысцкіх акупантаў і пад іх кантролем. Прычым выканаўцы ўчынілі злачынства ў значна большым маштабе, чым ім было прадпісана*", — сказаў І.Кузняцоў.

Паводле яго слоў, стужка, створаная беларускімі кінематаграфістамі, будзе прадстаўлена на міжнародных фестывалях дакументальнага кіно і паказана на замежных тэлеканалах.

Марат ГАРАВЫ.

ТАЯМНІЦЫ ГІСТОРЫІ

Горад-прывід

Новыя звесткі пра горад Казімір знайшоў краязнаўца са Светлагорска Вадзім Болбас.

Нагадаем, Казімір існаваў у XVII стагоддзі на тэрыторыі сучаснага Светлагорскага раёна і быў зруйнаваны ў 1655 годзе падчас вайны паміж Расійскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай. Казімір, утвораны ў 1643 годзе, меў Магдэбургскае права. Дакумент аб яго існаванні выявіў у 2001 годзе доктар гістарычных навук прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта Сяргей Рассадзін. Археалагічныя раскопкі Казіміра даюць навуцы "эталонны" матэрыял аб жыцці людзей у XVII стагоддзі, бо рэлікві культурнага слоя амаль не змешаны з рэчамі іншых эпох. Таму раскопкі фінансуюцца з фонду фундаментальных даследаванняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Але навукоўцам не хапае пісьмовых звестак аб Казіміры, бо гісторыкам былі вядомыя ўсяго два тэксты. І светлагорскі краязнаўца знайшоў новую пісьмовую крыніцу.

Вывучаючы кнігу польскага гісторыка Вітальда Бярнацкага "Паўстанне Хмяльніцкага: ваенныя дзеянні ў Літве ў 1648—1649 гг.", Вадзім Болбас звярнуў увагу на такія радкі: "...28 чэрвеня 1649 года князь Януш Радзівіл дайшоў да Казімеравай Слабады, дзе стаяла рота ў 100 драгунаў на чале з капітанам Маенам. Адсюль князь выправіў пасланца з лістом да Яна Казіміра, караля Рэчы Паспалітай. Апоўдні з Менску падцягнулася артылерыя. Князь адразу накіраваў яе ў Рэчыцу, дадаўшы да яе роту капітана Маена, якая пры гарматах рушыла..."

"Параўнаўшы ўсе факты, В.Болбас прыйшоў да высновы, што Казімерава Слабада — гэта і ёсць горад Казімір, у дачыненні да якога польскі гісторык ўжыў неафіцыйную назву. З гэтым меркаваннем пагадзіўся і прафесар Сяргей Рассадзін", — сказаў Т.Маслюкоў.

Ён паведаміў, што былы начальнік цэха светлагорскага вытворчага аб'яднання "Хімвалакно" В.Болбас свой адпачынак на пенсіі прысвячае турызму і краязнаўству. Яго родная вёска Казакова знаходзіцца непадалёк ад былога Казіміра. У 2006 годзе В.Болбас быў адным з першых добраахвотнікаў, якія разам з прафесарам С.Рассадзіным пачалі археалагічныя раскопкі на месцы старажытнага горада.

Марат ГАРАВЫ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.

«Славянский базар» — с понтами, роялем в кустах и «дежурной бригадой»

Через несколько недель в Витебске начинается XVII Международный фестиваль искусств "Славянский базар в Витебске".
Кто из артистов и чем недоволен на фестивале?
Почему каждый год в Витебск приезжают одни и те же музыканты?
Могут ли организаторы выполнить райдеры всех звезд?
И какие гонорары получают артисты на "Славянском базаре"?

"Народная воля" попыталась найти ответы на эти вопросы.

«За хорошее выступление хорошего артиста нужно хорошо платить...»

"Можно по-разному относиться к "Славянскому базару", но то, что этот международный проект стал брендом страны — это факт, — говорит народный артист Беларуси **Анатолий Ярмоленко**.

"Славянский базар" можно смело назвать фестивалем популярных искусств — как Беларусь, так и другие страны-участницы представлены в большинстве своем исполнителями поп-сцены. Причем из года в год одними и теми же. Анатолий Ярмоленко объясняет это финансовыми возможностями "Базара".

"На фестивале действительно много попсы, — отмечает Ярмоленко. — *Но нужно же на чем-то зарабатывать... Мне кажется, мы "застоялись" и в другом смысле — делается упор на все тех же российских исполнителей. Стоило бы думать не о количестве, а о качестве артистов. Но для всего нужны средства. При более высоком — не только государственном, но и спонсорском — финансировании "Славянский базар" мог бы стать на уровень "Евровидения".*

XVII международный фестиваль искусств "Славянский базар в Витебске" обещает участие **Димы Билана**, украинки **Ани Лорак**, сербской певицы **Елены Томашевич**, артистки из Швеции **Шарлотты Перелли**, а также других исполнителей, выступавших на нынешнем, а также предыдущих конкурсах "Евровидения".

Еще месяц назад организаторы "Базара" говорили, что в этом году белорусы смогут увидеть Аллу Пугачеву, Филиппа Киркорова, Валерия Леонтьева и Земфиру. Однако прогнозы не подтвердились — эти артисты не приедут на "Славянский базар". Такие повороты не новы для "Славянского базара". В 2007 году группа "t.A.T.u." отказалась от участия в "Славянском базаре" из-за низкого гонорара. А группа "Серебро" и вовсе на "Славянский базар" не приехала... Зрители уже гадают, кто из заявленных в этом году исполнителей "слетит" с фестиваля.

"Все приглашенные исполнители — коммерческие артисты, которые не приедут к нам бесплатно или за ту цену, за которую приглашаются белорусские артисты, — объясняет Анатолий Ярмоленко. — *А у "Славянского базара" есть бюджет, в который нужно вкладываться. Потому приезд или неприезд какого-либо певца — вопрос в первую очередь финансовый... Все любят витебский фестиваль. Но благотворительностью заниматься никто не будет. Потому что это их работа, за которую нужно платить. Нам пора привыкнуть, что за хорошее выступление хорошего артиста нужно хорошо платить".*

Кстати, Анатолий Иванович не назвал сумму своего гонорара за выступление на "Славянском базаре": *"Это коммерческая тайна. Если кто-то захочет, то он расскажет. Могу только сказать, что в этом году белорусским исполнителям немного увеличили гонорары, потому что раньше по сравнению со своими российскими коллегами мы вообще получали мизер..."*

«Белорусские звезды, оказывается, очень любят морепродукты»

Еще несколько лет назад организаторы фестиваля говорили, что приглашение практически любых иностранных суперзвезд им по карману, а проблема состоит в невозможности выполнить райдеры иностранных гостей — в Витебске попросту отсутствует необходимая инфраструктура. А в этом году на пресс-конференции, посвященной XVII Международному фестивалю искусств "Славянский базар в Витебске", его директор и генеральный директор государственного учреждения "Центр культуры "Витебск" **Родион Басс** заявил, что дирекция фестиваля полностью выполняет технические райдеры звезд, но порой требования многих звезд просто смешны.

"Они смешные, начиная от размера кровати, цвета машины и заканчивая меню, — заметил Басс. — *Кстати, белорусские звезды, оказывается, очень любят морепродукты. Списывают где-то эти райдеры, может, у западных или российских исполнителей. У некоторых белорусских артистов требования даже совпадают. Но мы отказываемся подписывать с артистами договора со сверхъестественными райдерами, если они, например, пишут "четыре сорта сыра в гримерку".*

"Сейчас у всех столько понтов, — говорит Анатолий Ярмоленко. — *Если зарубежные артисты просто привыкли к определенным условиям, то наши звезды смотрят на них и пытаются хоть в райдерах тянуться... Это торг, а иногда и капризы. Организаторы идут или не идут на уступки в зависимости от того, насколько оправданы и выполнимы условия. Ведь Витебск — город небольшой, и возможности его не безграничны... Но в принципе мы можем работать с любой европейской суперзвездой".*

«Не буду кричать о своем недовольстве на каждом углу...»

Понтуются или нет звезды, однако многие жалуются на отнюдь не иллюзорные недоработки организации. Многие участники прошлогоднего "Базара" столкнулись с неприятностями, в которых обвинили организаторов фестиваля. Директор певца **Игоря Николаева** не мог получить для него аккредитацию на выступление. **София Ротару** скромно посетовала, что в отеле "Лучеса", где она поселилась, отсутствует горячая вода. А машины с аппаратурой, костюмами и группой **Андрея Данилко** задержались на границе.

"Сказать, что лично я всем доволен, нельзя, — комментирует Анатолий Ярмоленко. — *Но я прекрасно понимаю все сложности проведения такого фестиваля и стараюсь принимать все как есть. И я не буду кричать о своем недовольстве на каждом углу. Я буду говорить об этом там, где это может дать какой-то результат...*

Кто бы как скептически ни относился к "Славянскому базару", я считаю, что этот фестиваль — брэнд, на который мы все должны работать. Например, Сан-Ремо — маленький приморский городок, который стал известен только благодаря ежегодному фестивалю, активно пиарившемуся. То же самое нам нужно сделать с Витебском, чтобы туда все стремились. Правда, у нас моря нет, но зато у нас есть Беловежская пуща, Браславские озера, Нарочь..."

ЕСТЬ ВОПРОС

Какой гонорар вам заплатили на «Славянском базаре»?

Измаил КАПЛАНОВ, композитор:

— Каждый сколько стоит, столько и получает на "Славянском базаре". Я получил достаточно достойный гонорар. Называть его не стану — считаю, это конфиденциальная информация. Но было это очень достойно. Какая сумма была в подписанном нами договоре, такую и заплатили...

Надежда МИКУЛИЧ, певица:

— Я участвовала в "Славянском базаре" так давно — сразу после чернобыльской катастрофы — что уже и не помню, сколько мне заплатили. А больше почему-то не приглашают...

Ольга ВОРОБЬЕВА, солистка группы "Camerata":

— Мы ездили от Белгосфилармонии как государственный коллектив и на руки никакого гонорара не получали. Получала что-то филармония, а сколько — мы не знаем.

Олег ХОМЕНКО, лидер группы "Палац":

— Последний раз мы выступали на "Славянском базаре" в 2000 году, я уже и не помню, какой был гонорар. В этом году мы будем на фестивале, думаю, гонорар будет стандартный, как и для всех команд. Пока еще обсуждения гонораров на этот год не было.

ЭКСПЕРТИЗА

Дмитрий ПОДБЕРЕЗСКИЙ, музыкальный критик:

«Публику приучили к пережеванной жвачке...»

"Обещанные в этом году исполнители — "дежурная бригада", ежегодно приезжающая на фестиваль, — *считает Дмитрий Подберезский.* — С одной стороны, можно понять боязнь организаторов приглашать более актуальных, но не таких раскрученных артистов. Потому что публика на них может не пойти. С другой — сегодня "Славянский базар" все больше напоминает "Золотой шлягер" — вместо того, чтобы иллюстрировать день сегодняшний и даже заглядывать в завтра, он руководствуется давно вымершими принципами.

Да, публика настроена на знакомое. Стоит немного отойти от привычного — и все, аудитория деревенеет, как на партийном собрании. Кураторы фестиваля — те, кто решает кого приглашать — приучили публику к пережеванной десять раз жвачке".

ТОЛЬКО ЦИФРЫ

В XVII международном фестивале искусств "Славянский базар в Витебске" принимают участие 35 стран.

В конкурсе молодых исполнителей 25 конкурсантов из 25 стран.

В детском музыкальном конкурсе участвуют 20 юных дарований, самому младшему из которых 7 лет.

40% бюджета XVII международного фестиваля искусств "Славянский базар в Витебске" формируется за счет продажи билетов.

Из бюджета союзного государства на финансирование фестиваля выделено 24, 8 млн российских рублей.

Суммы гонораров зарубежных звезд, согласно контракту, организаторы концертов не имеют права разглашать в течение 15 лет.

Раиса МУРАШКИНА, редактор отдела светской хроники газеты «Комсомольская правда» в Белоруссии»:

«Не удивлюсь, если Киркоров все же приедет»

Журналист "Комсомольскай правды" Раиса Мурашкина ездит на "Славянский базар" уже не первый год. Раиса знает практически все, что происходит за кулисами фестиваля.

"На "Славянском базаре" обычно каждый год была одна центральная суперзвезда, вокруг которой все вертелось, — *рассказывает Мурашкина.* — В прошлом году это была Патрисия Каас, в позапрошлом — Алла Пугачева. Это те звезды, которые держат в напряжении весь Витебск. Все внимание приковано к ним: что они скажут, как вздохнут, — есть ощущение, что прикоснулся к прекрасному. А в этом году пока такой звезды нет... Бабкина, Моисеев, Газманов, Боярский — звезды, за ними интересно наблюдать. Но они приезжают в Витебск каждый год и, мне кажется, зритель к ним уже привык.

Не хватает человека-скандала Филиппа Киркорова. Надо видеть, как его встречает зритель — люди просто с ума сходят! В этом году даже Преснякова с Агутиным нет, которые веселятся на фестивале по полной. Не будет Лолиты, которая может выйти из поезда в помятом костюме, щелкая семечки... Любой фестиваль — это атмосфера, а на "Базаре" нет такой фестивальной тусовки, как на "Новой волне" или "Пяти звездах".

Почему не будет Пугачевой, Киркорова, Земфиры? Думаю, возможны два варианта — либо эти артисты уже заняты на время "Славянского базара", либо у них такие гонорары, на которые Витебск заказать их не может.

Кстати, о гонорарах: нас этот вопрос тоже интересует, но, к сожалению, пробить эту информацию никак невозможно. Ни организаторы фестиваля, ни артисты не рассказывают о гонорарах.

Понятно, что любой артист поедет на фестиваль с гораздо большим желанием, чем на корпоратив или даже "сольник" в каком-нибудь региональном городе. Потому что фестиваль — это еще и телеэфир, причем сразу на несколько стран. Но за копейки, конечно, никто из россиян не поедет...

Может, нам стоит поискать спонсора для фестиваля... Если мы можем построить всем миром Национальную библиотеку, то почему бы нам не организовать всем вместе "Славянский базар"? Провести бы его с такой помпой, чтобы в Юрмале присели и сказали: "Ну, белорусы, вы зажгли, так зажгли..." После такого можно будет смело звать любую звезду и даже срезать гонорар, приговаривая: "Вы понимаете, куда вы едете?"

Глядя на заявленных артистов, могу сказать, что фестиваль этого года делает акцент на молодежную аудиторию — будет сильный день по "Евровидению", хороший концерт "Город 312" и "Токио". Но нет никакого рояля в кустах... Хотя, возможно, еще появится кто-то из суперзвезд. Это характерно для "Славянского базара" — в последний момент выкатить рояль из кустов. Я никак не верю, что решили провести фестиваль ровно и спокойно. Думаю, сюрприз может быть припасен на концерт в день открытия, на который и так билеты раскупятся. Так что я не удивлюсь, если Киркоров все же приедет".

Ольга ПРУДНИКОВА.

Лілія Студнева — іншапланецянка сучаснай эстрады

Днямі ў Вялікай зале Белдзяржфілармоніі адбыўся канцэрт Ліліі Студневай "Персіяначка".

Лілія выконвала песні на вершы Марыны Цвятаевай, Ганны Ахматавай, Іосіфа Бродскага, Уладзіміра Высоцкага, Булата Акуджавы. Вялікая частка музыкі да канцэрта напісана Уладзімірам Ткачэнкам.

У канцэрце прымалі ўдзел **Эдуард Ляснеўскі, Уладзімір Семянюк, Аляксандр Фурман, Уладзімір Ткачэнка, Вячаслаў Іназемцаў**. Лілія прызналася, што выпадковых людзей у гэты дзень на сцэне няма: усе — знаёмыя не адзін год сябры, якія і ў творчасці застаюцца блізкімі.

Вяла вечар актрыса Тэатра-студыі кінаакцёра **Ірына Нарбекава**, якая запаўняла перапынкі паміж музычнымі блокамі аповедамі пра жыццё і творчасць Ліліі.

"Булат Акуджава, калі ўжо быў сур'ёзна хворы, прыехаў у Мінск, — расказала Ірына Нарбекава. — *Ён не мог спяваць, таму проста чытаў вершы. Лілія, якая трапятліва ставілася да творчасці Акуджавы, пасля канцэрта зайшла да яго ў грымёрку, каб спытаць дазволу выконваць яго песні. Акуджава ёй адказаў: "Уся краіна спявае мае песні. Таму вам сам Бог загадаў гэта рабіць". Думаю, што благаславенне такога выдатнага чалавека было немалой крыніцай сіл і натхнення для Ліліі".*

Хваляванне, што папярэднічала выступу, не адбілася ні на артыстычнасці Ліліі, ні на майстэрстве яе выканання. Спявачка выходзіла на сцэну і ў выяве Кармэн, і ў гарнітуры блазана, і ў адзенні ўсходняй танцоркі.

Неаднаразова яе звалі іншапланецянкай сучаснай эстрады. У сіле і пяшчоце, з якімі Лілія звяртаецца са сцэны да гледачоў, сапраўды адчуваецца нешта незямное.

"У яе надзвычай выразны, з найбагацейшым тэмбрам голас, яна артыстычная і тэхнічная, а рэпертуарная палітыка безумоўна вылучае яе на фоне шаблоннай, адфарматаванай і безгустоўнай беларускай эстрады", — так адазваўся пра творчасць Ліліі Студневай музычны крытык **Зміцер Падбярэзскі.**

Дарэчы, спадар Падбярэзскі настойліва рэкамендуе прыслухацца да Ліліі Студневай тым, хто любіць у музыцы яркую індывідуальнасць, сапраўднае майстэрства і поўную адсутнасць штампаў.

Вольга ПРУДНІКАВА.

БЛІЦ

Ці збіраюцца беларускія музеі выкарыстаць кітайскі вопыт?

Кітай паступова ператвараецца ў краіну бясплатных музеяў. Праўда, зараз аматарам культурнага адпачынку варта загадзя падумаць аб бясплатным уваходным квітку, бо навіна аб бясплатных музеях выклікала небывалы ажыятаж, а максімальна магчымая штодзённая колькасць наведвальнікаў абмежавана. Цяпер квіткі ў папулярныя музеі Кітая трэба заказваць загадзя па тэлефоне або праз інтэрнет.

Ці збіраюцца беларускія музеі выкарыстаць кітайскі вопыт?

Сяргей ВЕЧАР, дырэктар Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі:

— У нас у музеі пакуль інтэрнет не выкарыстоўваецца — пакуль досыць іншых унутраных рэзерваў і метадаў для прыцягнення наведвальнікаў, колькасць якіх з года ў год расце. Мы паспяхова выконваем план аказання платных паслуг насельніцтву. Да таго ж прымаем наведвальнікаў не толькі ў самім музеі, але і выязджаем у арганізацыі, навучальныя ўстановы з перасоўнымі выставамі, лекцыямі. Ёсць нават чарга. Сёлета мы адкрылі тры новых выставачных экспазіцыі з нашых фондаў. Гэта унікальныя экспанаты з золата і срэбра. Дзейнічае выстава геральдыкі, таксама археалагічная выстава. Пакуль у нас асноўнай экспазіцыі няма, толькі экспазіцыйна-выставачныя праекты. У цяперашні час у музеі хапае наведвальнікаў. Вядома, трэба яшчэ павялічваць наплыў людзей. Колькасць, вядома, добра, але галоўнае, каб яна суправаджалася якасцю паслуг, якія прадастаўляюцца. Мы вельмі задаволеныя наведваннем музея.

Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ, дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа:

— Пакуль такой паслугі, як замова квіткоў праз інтэрнет, у нашым музеі няма. Але думаю, што ў перспектыве яна павінна з'явіцца. Справа ў тым, што ўжо прыйшоў для гэтага час. Мы праводзім розныя мерапрыемствы, вечары, тэматычныя выставы. Зараз прыйшло такое пакаленне, якому ўжо не цікава проста паслухаць лекцыі або пахадзіць па залах музея. Тым жа дзецям зараз патрэбна шмат інфармацыі, яны шмат чым цікавяцца. Варта ўлічваць і спецыфіку нашага музея, бо кола людзей, якія цікавяцца беларускай літаратурай, вельмі вузкае. Сёння мае вялікае значэнне галоснасць, рэклама, каб тыя ж дзеці зацікавіліся і прыйшлі ў музей.

Святлана ЛАКОТКА, дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту:

— Мы пакуль не плануем пераходзіць на бясплатныя білеты. У нас колькасць наведвальнікаў залежыць ад таго, якое мерапрыемства мы праводзім. Калі прадстаўлена звычайная выстава, то наплыў людзей досыць вялікі. Але мы вельмі залежым ад надвор'я, бо ў нас музей пад адкрытым небам, варта ўлічваць і гэтую спецыфіку. Таму нам трэба памяшканне, у якім можна будзе схавацца ад таго ж дажджу. Да таго ж у нас існуе праблема аўтастаянак. Пры вялікім наплыве людзей проста няма дзе паставіць машыну.

Вячаслаў КАЗАЧЭНАК, намеснік дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны:

—Не, мы пакуль што не практыкуем замовы квіткоў праз інтэрнет. Імкнемся прыцягнуць наведвальнікаў іншымі спосабамі. Закупілі электронны цір, плазменны экран, робім выставу зброі па новай тэматыцы. Паказваем тыя матэрыялы, якія раней не былі прадстаўленыя. У прынцыпе мы задаволеныя наведваннем нашага музея. Пачынаючы з 2001 года, у нас стала павялічвацца наведванне. Летась, напрыклад, музей наведала 144 тысячы чалавек. Калі ўлічыць той факт, што ў нас зараз няма такой вялікай колькасці філіялаў, як раней, то гэта даволі высокі паказчык.

У Нацыянальным мастацкім музеі таксама моцна здзівіліся пытанню з нагоды замовы квіткоў праз інтэрнет. Такой паслугі ў музеі зараз няма, і пакуль не прадбачыцца.

Дзмітрый БАБРОЎСКІ.

ТЫМ ЧАСАМ

Сёння ў Кітаі налічваецца больш за 2300 музеяў, 143 з якіх знаходзяцца ў Пекіне. Да цяперашняга часу сярэдняя колькасць наведвальнікаў у іх складала ў сярэднім 150 мільёнаў чалавек у год. Па меркаванні ўлад, палітыка вольнага доступу прыцягне ў музеі краіны яшчэ больш людзей і дапаможа істотна палепшыць узровень культурнага развіцця нацыі і гасцей Паднябеснай.

Як растлумачыў віцэ-міністр фінансаў Чжан Шаочунь, мэтавыя выдаткі ўсіх нацыянальных музеяў, мемарыяльных залаў і баз патрыятычнага выхавання будуць кампенсавацца з дзяржаўнага бюджэту, тады як крыніцай фінансавання працы правінцыйных музеяў стануць як нацыянальны, так і мясцовы бюджэт. У развіццё і падтрымку нацыянальнай культурнай праграмы ўрад Кітая інвестуе 171 мільён долараў.

ДИПКУРЬЕР

Ханс-Йохан Шмидт увлекся белорусской живописью

Белорусское искусство, в частности творчество художников, заслуживают того, чтобы о них знали больше в пределах Беларуси и за рубежом. Такое мнение озвучили в пресс-службе Офиса ОБСЕ со ссылкой на руководителя представительства господина Ханса-Йохана Шмидта.

"Господин посол большой ценитель искусства, в частности живописи, — рассказали в пресс-службе. — *За три месяца он успел познакомиться с творчеством белорусских художников и был приятно удивлен, открыв для себя их широкие возможности".*

По мнению руководства белорусского представительства ОБСЕ, важной задачей искусства является международный обмен между представителями культуры европейского Востока и Запада. С этой целью в Офисе ОБСЕ в Минске при поддержке Института Гете открылась экспозиция графики и фотографии белорусских художников "Движение". На выставке представлены работы трех белорусских авторов: **Юрия Алисевича, Михаила Борозны, Юрия Певнева**. Все художники в разное время закончили Белорусскую академию искусства, являются дипломантами различных выставок-конкурсов.

Выставка продлится до 31 июля. В течение этого времени свободный доступ в представительство будет открыт для всех желающих познакомиться с творчеством белорусских авторов в будние дни с 10.00 до 12.00, а также с 14.00 до 16.00.

Глава Офиса ОБСЕ в Минске Ханс-Йохан Шмидт приступил к исполнению своих обязанностей в Беларуси в феврале этого года. Дипломат глубоко убежден, что потенциал белорусских художников намного богаче, чем традиционно принято считать за рубежом.

Варвара НЕГОРЕЛОВА.

КСТАТИ

В интервью "Народной воле" глава офиса ОБСЕ в Минске Ханс-Йохан Шмидт сказал, что у него имеется довольно большая коллекция картин (около ста), которую он намерен пополнить работами белорусских художников.

БЛАГОТВОРИТЕЛЬНОСТЬ

Детей с заболеваниями сердца объединили «Веселые сердечки»

Этим ребятам по медицинским показаниям нельзя выезжать в летние оздоровительные лагеря. Нарушения ритма сердца, эндокардиты, врожденные пороки сердца — эти и другие болезни становятся преградой даже для общения со сверстниками. С такими диагнозами школьникам показано только санаторно-курортное лечение в специализированных санаториях и реабилитационных центрах, а если отдых — то с родителями, а не в детском коллективе. Но три года назад Белорусский детский фонд изменил эту практику.

Теперь на базе реабилитационного центра "Надежда XXI век" раз в год, обязательно летом, функционирует смена "Веселые сердечки". В лагерь со всей Беларуси едут школьники, страдающие тяжелыми сердечно-сосудистыми заболеваниями. До 80 процентов ребят перенесли операцию на сердце, а некоторым школьникам работу сердца обеспечивает кардиостимулятор. В 2006 году "веселых сердечек" было только 25 человек, в прошлом — при поддержке спонсоров — фонду удалось отправить на летний отдых уже 66 ребятишек. Такой же будет и смена в этом году.

— *Возможно, со стороны может показаться, что это не так и много: отправить в лагерь 65—70 детей,* — говорит доверенный врач Белорусского детского фонда Лидия Литвинович. — *Но не надо забывать, что эти детки имеют серьезные проблемы со здоровьем. Мы прекрасно понимаем, какая ответственность ложится на нас. Волонтерами в лагерь едут кардиолог и медицинская сестра из кардиохирургического отделения Детского кардиологического центра. А детям важно, что они отдыхают в кругу своих сверстников. "Надежда XXI век" принимает в одну летнюю смену 450 детей.*

"Веселые сердечки" — это продолжение программы Белорусского детского фонда "Детское сердце". Именно по этой программе за двенадцать лет 11 тысяч маленьких белорусов получили квалифицированную медицинскую помощь и лечение. Более 400 ребят с наиболее сложными патологиями сердца прооперировал легендарный американский кардиохирург Вильям Новик.

— *Мы знаем биографию каждого ребенка,* — говорит Лидия Литвинович. — *Они для нас стали как родные. Когда дети ехали на отдых первый год, мы еще не знали, получится ли организовать что-то подобное в следующем. А уже в прошлом году не были уверены, что получится в этом. Но у детского фонда есть хороший спонсор — ирландская организация "Project children Chernobyl international". Именно благодаря ей и появилась смена "Веселые сердечки".*

К слову, организацией летнего отдыха для больных детей Белорусский детский фонд начал заниматься не три года назад, а значительно раньше. 18 лет назад фонд начал осуществлять программу "Радуга надежды" для онкобольных детей, которым также по медицинским показаниям было запрещено отдыхать в обычных лагерях. Тогда-то и была придумана форма специализированной смены в обычном лагере, и назвали ту программу "Радуга надежды". Теперь уже в государственной программе "Дети Беларуси" есть пункт об оздоровлении в лагере "Зубренок" детей, перенесших онкологическое заболевание.

— *Надеюсь, что и у программы "Веселые сердечки" будет такое будущее,* — улыбается Лидия Литвинович.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

СТАЛІЦА

Як іх цяпер называць

Шэрагу вуліц, якія праектуюцца, і безыменных сквераў у Мінску прысвоены назвы.

Так, вуліцам, што праектуюцца ў жылым раёне "Каменная Горка", прысвоены назвы Каменнагорская, Нёманская, Казіміраўская, Дамброўская.

Падтрымана рашэнне аб увекавечанні ў назве праектаванай вуліцы на ўчастку ад вуліцы Янкоўскага да вуліцы Гарэцкага імя народнага артыста СССР, Героя Сацыялістычнай Працы, выдатнага дзеяча харавога мастацтва Рыгора Шырмы.

Назвы атрымалі і некалькі безыменных сквераў. Так, сквер на вуліцах Чыгуначнай і Мініна цяпер будзе насіць імя Георгія Канстанцінавіча Жукава, сквер на вуліцы Берасцянскай — горада-пабраціма Чанчунь, сквер на скрыжаванні вуліц Захарава і Першамайскай — Сімона Баліва-ра.

Найдено средство от болезни Паркинсона

Ученые израильского института технологии в Хайфе разработали лекарство против болезни Паркинсона, сообщают информагентства.

Испытание лекарства проведено на более чем 1 тыс. пациентов с ранними признаками этой болезни в 14 странах. Препарат под названием "Азилект" замедляет прогресс болезни. Ученые намерены предоставить властям США и Израиля результаты исследования.

Болезнь Паркинсона — заболевание мозга, развивающееся с возрастом, симптомами которого являются тремор, замедление движений, нарушение баланса. По всему миру от этого недуга страдают примерно 4 млн человек.

Трамвай узышоў на п'едэстал

Урачыста адзначылі ў Віцебску 110 год з дня адкрыцця ў горадзе першага трамвайнага маршруту. З гэтай нагоды абнавілася экспазіцыя народнага музея гісторыі віцебскага трамваю ў гарадскім трамвайным дэпо, а на тэрыторыі прадпрыемства адкрылі помнік трамваю. Ён уяўляе сабой усталяваны на пастаменце старадаўні маторны вагон узору 1920—1930-х гадоў. Гэты рарытэт на колах да нядаўняга часу працаваў у якасці буксіра, а ў дзень свайго ўсталявання самастойна ўз'ехаў на пачэснае месца, каб назаўжды застацца ў гісторыі горада, які адным з першых у Расійскай імперыі абзавёўся электронным пасажырскім транспартам.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПРЫГАВОР

Пакаранне — расстрэл

Гомельскі абласны суд абвясціў прыгавор у дачыненні да жыхара Гомеля Паўла Лянога, які восенню 2007 года згвалтаваў і жорстка забіў дзевяцігадовага хлопчыка. Прыгавор — вышэйшая мера пакарання праз расстрэл — педафілу абвясцілі ў дзень нараджэння (яму споўнілася 27 гадоў).

П.Ляной да ўчынення злачынства двойчы адбываў пакаранне ў месцах пазбаўлення волі за распусныя дзеянні сексуальнага характару. Першы раз суд прыгаварыў яго да трох гадоў пазбаўлення волі, але праз восем месяцаў (у 2003 годзе), вызваліўшыся па амністыі, П.Ляной зноў быў прыгавораны да пазбаўлення волі тэрмінам на восем гадоў за згвалтаванне непаўналетняга, аднак адсядзеў толькі чатыры гады і вызваліўся ўмоўна-датэрмінова.

24 верасня 2007 года, праз тры тыдні пасля вызвалення з месцаў пазбаўлення волі, П.Ляной згвалтаваў і жорстка забіў хлопчыка, які памёр ад разрыву сэрца. Маньяк нанёс яму 12 удараў у галаву, шыю, грудзі. Сябры хлопчыка дапамаглі міліцыі ў пошуках злачынцы, указалі, што менавіта з гэтым чалавекам вечарам, каля 19 гадзін, пайшоў Саша. Затрыманы педафіл доўга вадзіў міліцыю па лесе, адмаўляючыся паказаць, дзе схаваны труп і месца злачынства, аднак потым ва ўсім прызнаўся.

Маці памерлага хлопчыка Наталля Маладзецкая зазначыла ў інтэрв'ю БелаПАН, што прыгавор у дачыненні да маньяка — справядлівы. "Ён не варты жыцця, не варты нават турэмных сцен, мне было б цяжка жыць, усведамляючы, што недзе жыве і гэты падонак", — падкрэсліла маці. Характэрна, што бацькі педафіла і бацькі хлопчыка жылі па суседстве, апрача таго, забойца вучыўся ў адным класе з родным дзядзькам сваёй ахвяры.

Суд быў закрытым, маці і бабуля забітага, якія прысутнічалі на пасяджэннях, паведамілі БелаПАН, што абвінавачаны паводзіў сябе спакойна і цынічна, віну прызнаваў часткова, сцвярджаў, што не хацеў забіваць. Паводле слоў сваякоў хлопчыка, педафіл сам напісаў прамову ў сваю абарону для адваката на чатырох старонках. "Калі абвясцілі прыгавор, маньяк задрыжэў і заплакаў", — паведамілі сваякі забітага дзіцяці.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

КРЫМІНАЛ

Гора ад розуму

Супрацоўнікамі ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС затрыманы ўдзельнікі арганізаванай злачыннай групы, якія ўчынілі ў Мінску дзесяткі крадзяжоў грашовых сродкаў з выкарыстаннем падробных банкаўскіх картак.

Як паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, пры дапамозе спецыяльных прылад зламыснікі выраблялі падробныя пластыкавыя карткі, якія дазвалялі ім праз банкаматы атрымліваць доступ да рахункаў замежных грамадзян.

Падазроныя былі затрыманы днямі з доказамі віны каля банкамата ААТ "Пріорбанк" па вуліцы Радыяльная ў Мінску пры чарговым крадзяжы грашовых сродкаў. Гэта два мінчаніны ва ўзросце 25 і 26 гадоў. У аўтамабілі, які належыць аднаму з іх, аператыўнікі выявілі 23 падробныя банкаўскія карткі.

Падчас вобыскаў у арандаваных кватэрах затрыманых супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі яшчэ 423 пластыкавыя карткі-фальшыўкі, больш за 60 мільёнаў беларускіх рублёў, спецыяльныя прылады для запісу інфармацыі на магнітную паласу банкаўскай карткі і яе счытвання ("скімер"), а таксама іншую камп'ютэрную тэхніку.

На першых жа допытах фігуранты прызналіся, што з мая па чэрвень гэтага года выкарысталі больш за 40 падробных картак і выкралі такім чынам не менш за 70 мільёнаў рублёў. Ідэнтыфікацыйныя даныя, а таксама PIN-коды, неабходныя для вырабу і функцыянавання падробных картак, яны атрымлівалі ад невядомых асоб з-за мяжы праз інтэрнет.

У дачыненні да затрыманых распачата справа на падставе арт.212 Крымінальнага кодэкса (крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютэрнай тэхнікі). Гэты артыкул прадугледжвае пакаранне аж да пазбаўлення волі тэрмінам на 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Падазроныя змешчаны ў следчы ізалятар.

Аляксей АРЭШКА.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Каб зрабіць перадаплату за нумары «Народнай волі» ў другім паўгоддзі — у вас ёсць 5 дзён!

Мы не раз прасілі: не адкладвайце з афармленнем **перадаплаты** за нумары, якія будуць выходзіць у ліпені—снежні. І вось да канца месяца засталіся толькі 5 дзён. Каб не ўпусціць час, Вам трэба сёння—заўтра завітаць у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў любое паштовае аддзяленне і запоўніць бланк, узор якога мы друкуем у чарговы раз.

Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары другога паўгоддзя — зрабіце гэта за месяц, два, тры...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па **перадаплаце** ранейшыя: на месяц — 9500 рублёў для індывідуальных чытачоў і 15.000 рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць перадаплату, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь, июль				
август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь				
2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за апрель, май, июнь, июль				
август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь				
2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов.

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за апрель, май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами*** *и* ***обязательно*** *направляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ПАСЛУГІ
Прыём шклатары і іншая дапамога жадаючым.
Тэл. (8-033) 661-11-87 (МТС).

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 24.06.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №